ЛіМ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 20 (5026) 24 мая 2019 г. ISSN 0024-4686

16 +

Багдановіч і сваякі стар. 4

Рыгор Сітніца. Паэт і мастак стар. 7

Дунін-Марцінкевіч: шляхецтва і авантуры стар. 10

Праз кнігу ўбачыць краіну

«Дом кнігі “Светач”» адчыніў свае дзверы пасля рэканструкцыі. Цяпер гэта найбуйнейшая кніжная крама, якая ўжо даўно стала знакавым месцам для некалькіх пакаленняў кнігалюбаў. Сёння яна можа парадаваць не толькі прасторнымі заламі з шэрагамі самых розных навінак і класікі, але і зонай творчых прэзентацый і кавярняй, дзе можна пагартаць упадабаную кнігу. Рэканструкцыя доўжылася больш чым год, але крама працягвала працу і ў такіх няпростых умовах.

Павялічылася агульная плошча: раней гэта 1324,9 квадратных метра, цяпер — 1965,84. Пакуль колькасць кніг засталася ранейшая (каля 50 тысяч), але асартымент, натуральна, пастаянна будзе абнаўляцца. Аддзелы размешчаны па-іншаму: на першым паверсе знаходзяцца паліцы з нацыянальнай і замежнай мастацкай літаратурай, дзіцячыя стэлажы, кнігі, прысвечаныя мастацтву, гісторыі, атласы і карты, а таксама канцтавары, паштоўкі і сувеніры. Другі паверх займае метадычная і навукова-папулярная літаратура. На кожным паверсе — інфакіёск, які дазваляе даведацца, ці ёсць тое ці іншае выданне ў краме. Да таго ж з’явіліся сучаснае абсталяванне, а таксама навігацыя і інтэрактыўныя панэлі ў выглядзе гугл-перакладчыка для замежных гасцей.

Працяг на стар. 2 ►

Фота Кастуся Дробава.

На фота: у інтэр'ерах адноўленай кнігарні.

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 19020

акцэнты тыдня

Свята. Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2019», прысвечаны Году малой радзімы і 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, пройдзе на галоўных канцэртных пляцоўках горада 7—8 чэрвеня. Падчас музычнага форуму адбудуцца творчыя сустрэчы, выстаўкі, тэатральныя пастаноўкі. У дзень адкрыцця ў гарадскім Палацы культуры пройдуць II і III туры рэспубліканскага этапу нацыянальнага конкурсу маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні. Там жа Нацыянальны гістарычны музей прэзентуе экспазіцыю, прымеркаваную да 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Будзе прадстаўлена і фотавыстаўка «Беларусь памятае. Жаночы твар Перамогі», прысвечаная жанчынам-франтавічкам, работніцам тылу, чые імёны ўпісаны ў гісторыю Вялікай Перамогі.

Супрацоўніцтва. Беларускія выдаўцы гэтымі днямі бяруць удзел у XIV Санкт-Пецярбургскім міжнародным кніжным салоне, паведамляе БелТА. Сваю прадукцыю прадстаўляюць выдавецтвы «Беларусь», «Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі», «Мастацкая літаратура», «Вышэйшая школа», «Народная асвета», «Пачатковая школа». Асаблівая ўвага ўдзелена кніжным навінкам, прысвечаным 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, а таксама друкаванай прадукцыі, прымеркаванай да II Еўрапейскіх гульняў. На беларускім стэндзе запланаваны перагаворы па пастаўцы электроннага кантэнту выдавецтва «Вышэйшая школа» санкт-пецярбургскім кампаніям, а таксама круглы стол.

Выстаўка. Кніжная выстаўка, прымеркаваная да Дня славянскага пісьменства і культуры, адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, паведамілі ў НББ. У многіх краінах Усходняй і Паўднёвай Еўропы 24 мая ўшаноўваюць памяць вялікіх славянскіх асветнікаў Кірыла і Мяфодзія. У Беларусі гэты дзень адзначаецца як Дзень славянскага пісьменства і культуры. На выстаўцы прадстаўлена каля 50 дакументаў, перыяд выдання якіх складае больш за 120 гадоў. Тут можна таксама пабачыць работы рускіх і заходнееўрапейскіх аўтараў, першыя Кірыла-Мяфодзіеўскія зборнікі і падручнікі царкоўнаславянскай мовы. Дапаўняюць экспазіцыю факсімільныя выданні. Выстаўка будзе працаваць да 30 ліпеня.

Конкурс. Спецыяльны фонд Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі, Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі і тэлеканал АНТ пачынаюць падрыхтоўку агульнарэспубліканскага дзіцячага тэлевізійнага конкурсу «Талент краіны» (чацвёрты сезон), паведаміла БелТА. Стаць удзельнікам маштабнага тэлепраекта могуць адораныя дзеці з усіх куткоў Беларусі ва ўзросце ад 5 да 15 гадоў. Заявіць аб сабе на ўсю краіну змогуць не толькі сольныя выканаўцы, але і творчыя калектывы. Перавагу будуць мець удзельнікі, лаўрэаты і прызёры нацыянальных і міжнародных конкурсаў. Эфіры «Таленту краіны» запланаваны на восень.

Моладзь. Рэгіянальнае дзіцячае свята мастацтваў «Двина — Дзвіна — *Daugava*» ў Верхнядзвінску збярэ ў нядзелю амаль 300 удзельнікаў з Беларусі, Расіі і Латвіі, паведамілі ў райвыканкаме. Маладыя артысты дадуць гала-канцэрт. На тэрыторыі парку будуць працаваць выязны гандаль, дзіцячыя атракцыёны і гульнявыя пляцоўкі з конкурсамі, віктарынамі і этнадыскатэкай. Вырабы і сувеніры прадставяць на выстаўцы-кірмашы народныя майстры. Будзе арганізаваны паэтычны дворык і фотавыстаўкі.

Агляд афіцыйных падзей ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ

Праз кнігу ўбачыць краіну

— Як чалавек, які вельмі моцна любіць свой горад, які нарадзіўся і рос непадалёк ад «Светача», адзначу, што кнігарня заўсёды была маім любімым месцам, — расказаў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Максім Рыжанкоў. — У маім жыцці кніга адыгрывала важную ролю. Я перачытаў усё, што было ў хатняй бібліятэцы. Хадзіў у кнігарню, а паколькі грошай лішніх не было, то часам проста каб пачытаць, а не набыць. Таму вельмі рады адкрыццю новай крамы, такой рэінкарнацыі «Светача» ў сучасным хайтэк стылі. Важна, што крама не толькі прыгожая, але і светлая, адкрытая, адсюль можна бачыць горад. Істотна тое, што гэтае месца дае чытачу новыя магчымасці: можна прыйсці, пасядзець у кавярні, узяць кнігу, вырашыць, падабаецца яна ці не. З'явілася спецыяльная зона для пісьменнікаў, дзе яны маюць магчымасць прадставіць сваю творчасць і сустрэцца з чытачамі. Гэты сучасны будынак па праве стане адной з жамчужын культурнага жыцця сталіцы.

Дарэчы, першай сустрэчай у абноўленай краме стала прэзентацыя новай кнігі Наталлі Батраковай «Бясконцасць любві, бясконцасць смутку… (кніга другая)». Сустрэча завяршылася стартам продажу навінкі ва ўсіх крамах «Белкнігі». Зала прэзентацый будзе дзейнічаць пастаянна. Яна разлічана на 60 месцаў для наведвальнікаў і адчынена для ўсіх творцаў і іх чытачоў. Злева ад яе — кафэ, дзе можна выпіць кавы, знаёмячыся з жаданым творам.

Цалкам змяніліся фасад і інтэр'ер будынка. Так, аўтары інтэр'ера адзначаюць, што ўзялі за аснову скандынаўскі стыль, але прыбралі «халоднасць», дадалі цеплыні і ўтульнасці. Фасад жа абноўлены ў чорным колеры, што адпавядае сучаснай канцэпцыі развіцця праспекта Пераможцаў. На будынку больш няма шыльды «Дом кнігі "Светач"» — крама мае назву сеткі «Белкніга». Цяпер у яе два ўваходы. Гэта было зроблена для прыцягнення пакупнікоў, асабліва моладзі, з боку ГЦ «Галерэя». Самае прахадное месца, паміж уваходамі, займаюць паліцы беларускай літаратуры. Сярод аўтараў, кнігі якіх можна пабачыць яшчэ не падышоўшы да стэлажоў, — Уладзімір Караткевіч, Святлана Алексіевіч, Мікалай Чаргінец.

Фота Кастуся Дробава.

Міністр інфармацыі Аляксандр Карлюкевіч уручае сімвалічны ключ ад кнігарні.

— Зараз, зайшоўшы ў «Светач», можна ўбачыць праз друкаваную кнігу нашу краіну, — адзначыў міністр інфармацыі Аляксандр Карлюкевіч. — Адкрыццё такой кнігарні — знакавая падзея. Яна мае вялікае значэнне для развіцця айчыннага кнігагандлю. Адметна, што ў «Белкнігі» з'явіўся такі праект, які паказвае, як па-сучаснаму ўзаемадзейнічаць з чытачом. Я ўдзячны супрацоўнікам кнігарні, якія вытрымалі гэты націск перабудовы і рамонту, што, безумоўна, ускладняла работу з пакупнікамі. Але ўсё будзе вернута да жыцця і актыўнай дзейнасці.

Выдатна, што гандлёвыя плошчы пашырыліся і сталі адчыненыя для сучасных твораў. Да таго ж у новай кнігарні цудоўная лагістыка: можна знайсці адказы на пытанні жыцця грамадства ва ўсіх сферах.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

«Акадэмкніга» запрашае на сустрэчу з Мікалаем Чаргінцом

Сталічная кнігарня «Акадэмкніга», што ў цэнтры горада па праспекце Незалежнасці, ладзіць прэзентацыі навінак ледзьве не штодня. 29 мая а 18-й гадзіне ў прэстыжную кнігарню завітае старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь празаік Мікалай ЧАРГІНЕЦ.

Мікалай Іванавіч раскажа пра новыя выданні сваіх даўно знаёмых чытачу твораў, а таксама прадставіць раманы, што выйшлі апошнім часам. Усе гэтыя кнігі можна будзе набыць у кнігарні і, зразумела, атрымаць аўтограф. Запрашаючы чытачоў на сустрэчу са знакамітым пісьменнікам, арганізатары падкрэсліваюць, што размова будзе надзвычай цікавая. Мікалай Іванавіч паабяцаў распавесці не толькі пра ўласныя творы, але і пра сучасны літаратурны працэс, выкласці свае погляды на многія з'явы ў сённяшнім жыцці.

Нагадаем, што творчасць Мікалая Чаргінца адзначана самымі прэстыжнымі прэміямі як у Беларусі, так і ў Расійскай Федэрацыі. Пісьменнік — лаўрэат прэміі «Зоркі Садружнасці», міжнародных літаратурных прэмій імя А. Фадзеева і В. Пікуля, іншых высокіх адзнак.

Мікола БЕРЛЕЖ

Хто напіша гімн пчале?

У Саюз пісьменнікаў Беларусі звярнуўся віцэ-прэзідэнт Апіславіі, старшыня саюза «БелАпіЮніян», капелан пчаляроў Беларусі, дактарант, канонік-дэкан Уладзіслаў Завальнюк. У Мінску восенню 2020 года адбудзецца чарговы — XXIII кангрэс-форум — Апіславія. Гэта сусветнае пчалярскае аб'яднанне, у склад якога ўваходзяць 48 краін Еўропы і Азіі.

Плануецца, што на мерапрыемства збяруцца дэлегаты з 60 краін свету, а таксама каля 5—7 тысяч гасцей. Цяпер праводзяцца планавыя і кантактныя напрацоўкі ў дачыненні да будучай значнай падзеі не толькі для беларускіх пчаляроў, але і для ўсёй краіны.

— Падчас сустрэчы ў Маскве аргкамітэт Апіславіі даручыў беларускай дэлегацыі паклапаціцца пра словы і музыку — гімн Апіславіі, — заўважае Уладзіслаў Завальнюк, які лічыць, што ў такой творчай справе аб'яднанню пчаляроў аніяк не абысціся без пісьменніцкай арганізацыі.

Таму кожны пісьменнік можа паспрабаваць напісаць гімн Апіславіі, які прагучыць на адкрыцці кангрэса-форуму пчалярскіх аб'яднанняў у Мінску ў 2020 годзе. Варта мець на ўвазе: гімн будзе перакладзены на англійскую мову, бо ў Саюзе Апіславіі дзейнічаюць дзве мовы: англійская і руская. Нашым аўтарам прапануецца стварыць словы гімна на рускай.

Нагадаем, што ў кантэксце верша-гімна павінны быць: праслаўленне пчалы, пчалінага рою, пасекі, навакольнай прыроды, чалавека і Творцы-Бога. Пчала пераўтварае прыроду з кветкі ў плод, насенне — у хлеб. І зноў квітнее кветка-акіян жыцця рытмічна зменлівай, але сталай, жывой прыроды. Пчала і рой — сіла аднаго ў адзінстве многіх! Жывая прырода, чысты мёд, здаровае даўгалецце!

Спадзяёмся, што сярод творцаў нашага Саюза знойдуцца ахвотныя далучыцца да гэтай ганаровай справы.

Чакаем тэксты гімна да 1 верасня 2019 года. Журы на чале з Уладзіславам Завальнюком вызначыць аўтара гімна, які будзе запрошаны на міжнародны кангрэс-форум Апіславія. Гімн Апіславіі неабходна накіраваць на электронны адрас СПБ: *oo-spb@tut.by* з адзнакай: конкурс «Апіславія».

Алена СТЭЛЬМАХ,
першы намеснік старшыні
Саюза пісьменнікаў Беларусі

Мінскае гарадское аддзяленне СПБ запрашае:

***25 мая** — на пасяджэнне літаратурнага аб'яднання «Доблесць» пры Цэнтральнай бібліятэцы Цэнтральнага дома афіцэраў (11.00).*

***28 мая** — на святочнае падвядзенне вынікаў літаратурнага конкурсу, прысвечанага 75-годдзю вызвалення Беларусі, у Мемарыяльную залу Дома літаратара (16.00).*

***29 мая** — на ўрачыстае свята з удзелам літаратурнай студыі «Вобраз» і пісьменнікаў Валянціны Драбышэўскай, Міхася Пазнякова, Наталіі Касцючэнкі ў СШ № 168 (10.00).*

***29 мая** — на вечар паэзіі і песні «Паэзіі радок пявучы» ў Мінскі гарадскі Тэатр паэзіі пры Цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы (17.30).*

***30 мая** — у Школу юнага паэта пры Мінскім гарадскім аддзяленні СПБ (вул. Фрунзэ, 5 — 309) (14.30).*

Брэсцкае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

***25 мая** — на прэзентацыю выстаўкі вядомага аграрыя, пісьменніка Аляксея Скакуна «Прыцягненне зямлі» ў гарадскую бібліятэку імя А. С. Пушкіна (14.00).*

***29 мая** — на абласны этап конкурсу юных чытальнікаў «Жывая класіка» ў абласны цэнтр маладзёжнай творчасці (10.00).*

Віцебскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

***30 мая** — на адкрыццё мемарыяльнай дошкі памяці пісьменніка Барыса Беляжэнкі ў Бачэйкаўскую сельскую бібліятэку Бешанковіцкага раёна з удзелам Тамары Красновай-Гусачэнкі і пісьменнікаў Віцебшчыны (11.00).*

Гродзенскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

***29 мая** — на чарговае пасяджэнне грамадскага дыскусійнага клуба «Словадром» у Гродзенскую абласную навуковую бібліятэку імя Я. Ф. Карскага (17.00).*

Магілёўскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

***25 мая** — на прэзентацыю кнігі Наталлі Ніканчук «...Кранаючы неба рукамі» ў Горацкі раённы гісторыка-этнаграфічны музей (12.00).*

***28 мая** — на пасяджэнне літаратурнай гасцёўні «Магія слова» ў Магілёўскую абласную бібліятэку імя У. І. Леніна (17.00).*

фестывалі

Аблокі так высока…

Да вытокаў, да вытокаў
Мы вяртаемся штодзень,
Бо аблокі так высока
Больш не плаваюць нідзе.
Мы на лес глядзім вячысты,
Светлай солімся вадзе,
Бо душа такою чыстай
Не бывае больш нідзе.
Ад былінкі да дзяўчынкі
Свет напоўнены красой:
То засвеціцца смяшынкай,
То расчуліцца слязой…

Алесь Пісьмянкоў

У горадзе Касцюковічы Магілёўскай вобласці адбыўся V рэгіянальны фестываль паэзіі і аўтарскай песні «Пісьмянкоў луг». Свята беларускага паэтычнага слова традыцыйна наведалі госці з розных раёнаў Магілёўскай вобласці і наогул Беларусі, а таксама Смаленскай вобласці Расіі.

Прысутных чакала святочная канцэртная праграма «Песні роднай зямлі»; вечар паэзіі і музыкі «Крыніцы душы»; вячэрняя эстрадна-забаўляльная праграма. Пра «Літаратурную спадчыну Касцюкоўшчыны» распавядала музейная выставачная экспазіцыя, бібліятэчныя сеткі раёнаў Магілёўскай вобласці зладзілі «Літаратурнае падарожжа па старонках пісьменства роднага краю» з прэзентацыямі кніг.

Свята ладзіцца ў памяць пра паэта Алеся Пісьмянкова, якога нарадзіла і ўзрасціла касцюковіцкая зямля. Удзельнікі здзейснілі краязнаўчую аўтавандроўку ў вёску Бялынкавічы, на малую радзіму паэта, дзе размешчаны гісторыка-культурны аб'ект «Пісьмянкоў луг». На велізарны камень як знак непарушнасці паэтычнага беларускага слова ўсклалі жывыя кветкі. Тут ганаровыя госці ўзялі ўдзел ў літаратурна-музычнай кампазіцыі «Будзем, людзі, шчаслівыя ўсе!». У чароўным куточку Беларусі з вуснаў навучэнцаў вясковай школы гучалі вершы Алеся Пісьмянкова. Пранікнёна адазваліся словы яго сяброў і калег па пяры Аляксандра Бардоўскага, Віктара Патапенкі. У гэты момант на чыстым блакітным небе сталі кружыць два буслы. Сама прырода нагадала, што Алесь побач з намі, але жыве ў вершах і песнях.

Каля памятнага знака ў Бялынкавічах.

У дзіцячай школе мастацтваў адбыліся пісьмянкоўскія паэтычныя чытанні «У родным слове цэлы свет» з удзелам ганаровых гасцей свята, членаў Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі на чале з Аляксандрам Казекам. Прачыталі свае вершы Уладзімір Ясеў, Валянціна Габрусева, Вольга Бялова, Мікола Леўчанка, Наталля Азаранка. Сваімі думкамі падзяліліся госці свята і маладыя паэты.

Напрыканцы свае ўзнагароды атрымалі пераможцы конкурсаў паэзіі і аўтарскай песні, удзельнікі выставак дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва і бібліятэчных імпрэз-прэзентацый. Цёплая атмасфера натхніла мясцовых жыхароў, якія шануюць, зберагаюць і памнажаюць літаратурную спадчыну раёна.

Наталля АЗАРАНКА

прэзентацыя

Весялей і лягчэй — з азбукамі

Нягледзячы на існаванне шматлікіх якасных дапаможнікаў для дзяцей, літаратура працягвае поўніцца цікавымі пазнавальнымі творамі для маленькіх беларусаў. Прэзентацыяй адразу дзвюх кніг — «Азбука ў вершах і малюнках» (Мінск, 2018) і «Маленькая азбука вялікай краіны» (Мінск, 2019) — парадаваў дзяцей настаўнік, паэт і пісьменнік Віктар Кажура. Сустрэчу, якая суправаджалася вясёлымі гульнямі, падарункамі, а таксама розыгрышам кніг, творца зладзіў сумесна з выдавецтвам «Пачатковая школа», дзе выйшлі абедзве кніжкі.

«Азбукі» Віктара Кажуры — выданні з адметнымі малюнкамі і займальнымі вершамі на кожную літару алфавіта, якія расказваюць маленькім чытачам пра падзеі і з'явы, звязаныя з паўсядзённым жыццём. Кнігі разлічаны на дашкольны і малодшы школьны ўзрост.

Так, ідэя стварыць «Азбуку ў вершах і малюнках» з'явілася ў пісьменніка пасля нараджэння ўнучкі, таму фактычна вершы пісаліся для яе. Потым Віктар Кажура пісаў і для ўнука, пра што згадана ў прысвячэнні да адной з кніг. «Азбука ў вершах і малюнках» стала вельмі важнай не толькі для аўтара, але і для дзяцей ды іх бацькоў. У значнай ступені так склалася дзякуючы выразным ілюстрацыям, якія стварыла дасціпная мастачка Алена Саковіч.

«Маленькая азбука вялікай краіны» — нібыта другая ступень для чытача, якая адкрывае не толькі беларускую мову, але і ўсю Беларусь. Аўтар прыкмячае: кніга пра ўсё тое, чым багатая краіна. Адрозненне ад папярэдняй азбукі яшчэ ў тым, што на кожнай старонцы ёсць невялічкія тлумачэнні з'явы ці прадмета, пра якія распавядаюць вершаваныя радкі. «Маленькую азбуку вялікай краіны» адмыслова аформіла Вікторыя Марус.

Яўгенія ШЫЦЬКА

памяць

А ў спадчыну — вершы

22 мая не стала Юрыя Фатнева.

Нарадзіўся будучы пісьменнік 10 лютага 1938 года ў сяле Акімаўка Краснашчокаўскага раёна Алтайскага краю ў сям'і ваеннаслужачага.

Незадоўга да пачатку Вялікай Айчыннай вайны сям'я пераехала на Беларусь. Падчас акупацыі жыў на Гомельшчыне, потым — на Украіне. Пасля вайны сям'я зноў вярнулася на Беларусь. Вучыўся ў Новасвержанскай сярэдняй школе Стаўбцоўскага раёна. Затым жыў і працаваў у Казахстане, Гомелі, Бранску, Ленінградзе. З 1990 года — у Гомелі.

У друку выступаў з вершамі. Аўтар шматлікіх зборнікаў паэзіі на рускай мове.



Саюз пісьменнікаў Беларусі глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю выдатнага паэта Юрыя Сяргеевіча ФАТНЕВА і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

Гомельскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі смуткуе з выпадку смерці выдатнага паэта і празаіка, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Юрыя Сяргеевіча ФАТНЕВА і выказвае глыбокае спачуванне яго сям'і, родным і блізкім з прычыны вялікай страты.

ЛіМ КАЛЯНДАР

25 мая — 100 гадоў з дня заснавання (1919) Беларускага дзяржаўнага музея. Існаваў да 1941 г.

25 мая — 80 гадоў з дня нараджэння Мікалая Стомы (1939—1993), плакатыста.

25 мая 70-годдзе святкуе Леанід Барткевіч, заслужаны артыст БССР.

27 мая — 105 гадоў з дня нараджэння Антона Бялевіча (1914—1978), паэта, празаіка, перакладчыка.

27 мая — 80 гадоў з дня нараджэння Генадзя Гаркунова (1939—1999), майстра дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва.

27 мая 80 гадоў спаўняецца Вадзіму Салееву, культуролагу, мастацкаму і тэатральнаму крытыку, філосафу, заслужанаму дзеячу культуры Рэспублікі Беларусь.

27 мая — 75 гадоў з дня нараджэння Валерыя Бартосіка (1944—2007), расійскага і беларускага рэжысёра.

27 мая 70-гадовы юбілей адзначае Ала Ельяшэвіч, заслужаная артыстка Рэспублікі Крым.

28 мая 60-годдзе святкуе Сяргей Логвін, скульптар.

29 мая 80 гадоў спаўняецца Дзеніславу Нічыпаровічу, празаіку.

29 мая 80-гадовы юбілей адзначае Ларыса Максімава, піяністка, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь.

29 мая — 80 гадоў з дня нараджэння Людмілы Пісаравай (1939—2011), заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь.

29 мая 60-годдзе святкуе Таццяна Гардашнікава, плакатыст, графік.

29 мая 70 гадоў спаўняецца Наталлі Татур, паэтэсе.

30 мая 70-гадовы юбілей адзначае Мікалай Цудзік, мастак.

31 мая 75-годдзе святкуе Уладзімір Андрыянаў, майстар дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва (кераміка).

31 мая 70 гадоў спаўняецца Юрыю Панкрацу, мовазнаўцу.

Ідзе падпіска на II паўгоддзе 2019 г.

«ЛіМ»	1 месяц	падпісны індэкс
Для індывідуальных падпісчыкаў	7 р. 04 к.	63856
Ведамасная падпіска	19 р. 22 к.	638562
Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў	4 р. 94 к.	63815
Льготная падпіска для ўстаноў культуры і адукацыі	14 р. 62 к.	63880

люстэрка тыдня

У Маскоўскім дзяржаўным інстытуце міжнародных адносін адкрылася выстаўка «Беларусь і беларусы». Прадстаўлены экспанаты з фондаў Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі, паведамілі ў прэс-службе Пасольства Беларусі ў Расіі. Арганізатарамі выстаўкі выступілі Пасольства Беларусі ў Расіі і беларускае зямляцтва МДІМА. Экспазіцыя дэманструе гістарычны агляд, які закранае асноўныя этапы развіцця нашай краіны, асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай дзейнасці беларусаў, — раскрывае здабыткі культуры беларускай нацыі як неад'емнай часткі сусветнай супольнасці. Падчас цырымоніі адкрыцця выстаўкі беларускія студэнты МДІМА чыталі вершы на роднай мове.

Пасольства Рэспублікі Беларусь у Францыі паведамляе пра яшчэ адзін факт вяртання культурных каштоўнасцяў у нашу краіну. Пры дапамозе актыўнага прадстаўніка беларускай дыяспары ў Францыі Анастасіі Данілавай рэалізаваны праект па набыцці для фондаў Мірскага замка французскай шпалеры ручной работы XVII стагоддзя. Менавіта такія шпалеры заходнееўрапейскай вытворчасці ўпрыгожвалі замкі і палацы беларускай шляхты, у тым ліку і Мірскі замак. Шпалера выраблена ў г. Абюсон дэпартамента Лімузэн з выкарыстаннем воўны і шоўку і раней знаходзілася ў прыватнай калекцыі. Пасля рэстаўрацыі шпалера зойме сваё месца ў экспазіцыі аб'екта Сусветнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА.

Дні беларускай культуры ў Арменіі прайшлі ў Ерэване на мінулым тыдні паводле праграмы супрацоўніцтва паміж міністэрствамі культуры дзвюх краін, паведамляе Арменпрэс. Адкрылася праграма гала-канцэртам у Нацыянальным акадэмічным тэатры оперы і балета, дзе выступілі Дзяржаўны акадэмічны ансамбль танца Беларусі, спявачкі Алёна Ланская і Іскуі Абалян, а завершылася паказам фільма «Вайна. Застацца чалавекам» кінастудыі «Беларусьфільм» у зале Саюза кінематаграфістаў Арменіі.

У Расіі ў кургане пад Астраханню знайшлі старадаўні скарб. У ім — золата, срэбра, зброя, упрыгожванні з бірузы, паведамляе расійскі тэлевізійны Пяты канал. Археолагі датуюць пахаванне IV стагоддзем да нашай эры. Ёсць здагадка, што ім атрымалася выявіць пахаванне сармацкага правадыра або іншай знатнай персоны. Археолагі арганізавалі экспедыцыю пасля таго, як мясцовы фермер знайшоў побач з хатай старадаўні бронзавы кацялок і перадаў яго ў музей на экспертызу. Да пачатку лета археолагі плануюць цалкам даследаваць курган. А потым адкрыюць выстаўку.

На сайце *Change.org* размешчана петыцыя з патрабаваннем перазняць восьмы, апошні, сезон культавага серыяла «Гульня прастолаў». Да гэтага часу яе падпісалі больш чым 1 млн чалавек. Аўтар петыцыі лічыць, што Дэвід Бенёф і Дэн Уайс прадэманстравалі абсалютную некампетэнтнасць як сцэнарысты ў сітуацыі, калі ў іх няма гатовага матэрыялу, на які можна абаперціся. Маюцца на ўвазе кнігі. Серыял створаны па матывах раманаў знакамітага амерыканскага пісьменніка-фантаста Джорджа Марціна «Песня лёду і полымя». На дадзены момант пабачылі свет пяць з сямі тамоў серыі. Такім чынам, экранізацыя значна апярэджвае кніжныя падзеі.

Агляд цікавінак ад Іны ЛАЗАРАВАЙ

пасля-слоўе

Дзе здзяйсняюцца мары,

альбо Вобраз, які лучыць пакаленні

Творчы праект Алены Стэльмах і Уладзіслава Цыдзіка «Бачу Беларусь такой» знайшоў розгалас як у нашай краіне, так і за мяжой. Прэзентацыі фотаальбома ў спалучэнні з аднайменнай фотавыстаўкай адбыліся ў розных бібліятэках Беларусі — Нацыянальнай, Прэзідэнцкай, у штаб-кватэры СНД у Мінску, у сталічным касцёле Святых Сымона і Алены.

Аўтары, члены Саюза пісьменнікаў Беларусі, прадстаўлялі сваю творчасць у Казахстане, Дагестане. Спартсмены і госці II Еўрапейскіх гульняў таксама змогуць пабачыць непаўторныя відарысы Беларусі з падачы Уладзіслава Цыдзіка. Яго фотаработамі ўпрыгожаны галерэі галоўнай пляцоўкі міжнароднага спартыўнага форуму — мінскага стадыёна «Дынама».

Днямі адбылася яшчэ адна знакавая падзея: да ініцыятывы пісьменніка і фотамайстра выказаць сваё бачанне Айчыны далучылася Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк г. Мінска (а гэта 18 кніжніц).

— Пачатак вялікай творчай плыні дала ў лютым гэтага года Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш, падчас якой ва ўсіх дзіцячых бібліятэках г. Мінска адкрыліся кніжныя экспазіцыі, дзе знайшлі адлюстраванне самыя розныя погляды на асаблівасці беларускай культуры, традыцый, самавітага калярыту, — расказвае дырэктар ЦСДБ Тацяна Швед. — Мае калегі-бібліятэкары прадставілі не толькі кніжныя выданні, прысвечаныя Беларусі, але і пастараліся ўпрыгожыць іх нацыянальнымі сімваламі, вырабамі прыкладнога мастацтва. У бібліятэчных залах з'явіліся вельмі прывабныя куточкі, дзе з вялікай ахвотай затрымліваюцца чытачы.

Аўтары праекта «Бачу Беларусь такой», усхваляваныя актыўнай падтрымкай іх творчага кірунку, прапанавалі бібліятэкарам прадоўжыць супрацоўніцтва. Гэтым разам узнікла ідэя правядзення конкурсу пад той жа назвай. З'явілася і Палажэнне аб конкурсе. Цяпер ужо абудзіліся юныя чытачы, якім прапанавалі праявіць сябе ў чатырох намінацыях: «Паэзія», «Проза», «Фотаздымак» і «Малюнак».

— Нас вельмі ўсхвалявалі работы канкурсантаў, — зазначыў Уладзіслаў Цыдзік. — Безумоўна, у першую чаргу звярнуў увагу на фотаздымкі: сонечна-зорныя, цёпла-праменныя, шчымліва-трапяткія. У кожнага з нас сваё пачуццё радзімы, і тым яно каштоўнае. Асабліва кранае, калі прыхільнасць да родных каранёў выказваюць дзеці. Многія работы па-сапраўднаму здзіўляюць: юныя творцы ўбачылі Беларусь велічнай і змаглі дапытлівым вокам разгледзець яе да таемных дробязей. Сярод пераможцаў — вучаніца СШ № 186 г. Мінска Ксенія Глебава, якая назвала сваю фотаработу «Усмешка вялікага горада». Вучаніца гэтай жа школы Сафія Шчарбачэня выбрала філасофскую тэму — «Супакаенне», а Ангеліна Ласоцкая з той жа СШ № 186 запрасіла ў «Райскі куточак».

— Паэзія і проза юных канкурсантаў таксама дапамагае стварыць багаты вобраз роднай краіны. Праз мастацкае слова дзеці выказваюць лепшыя пачуцці да месца, дзе нарадзіліся, да сваёй матулі, да першых жыццёвых урокаў, — падкрэсліла Алена Стэльмах.

У гэтых намінацыях журы адначыла работы вучаніцы СШ № 207 г. Мінска Юліі Кугаевай, вучаніцы сталічнай СШ № 204 Лізаветы Іванчык, вучаніцы СШ № 56 г. Мінска Надзеі Расоўскай, вучаніцы сталічнай СШ № 67 Вікторыі Салановіч і вучня гімназіі № 1 г. Мінска Ігара Жыгалковіча.

На малюнках юных творцаў — гераічная Беларусь. Пацвярджэннем таму — работа «Салют Перамогі» вучаніцы СШ № 200 г. Мінска Крысціны Адушкінай. «Беларусь — векапомная» — такі незабыўны вобраз нашай краіны стварыла Соф'я Кляцкова са СШ № 138. Беларусь — краіна, дзе здзяйсняюцца мары і надзеі, сцвярджае вучаніца СШ № 54 Настасся Цімашэнка.

Падчас узнагароджвання канкурсантаў.

Асобныя падзякі ад арганізатараў конкурсу атрымалі вучаніца СШ № 186 Кацярына Смуціна, 3 «Б» клас СШ № 144 г. Мінска, дзіцячая бібліятэка імя В. Віткі, дзіцячыя бібліятэкі № 10 і № 15, цэнтральная дзіцячая бібліятэка імя М. Астроўскага.

Узнагароджанне пераможцаў адбылося ў мемарыяльнай зале Дома літаратара.

Дзеці — пераможцы конкурсу, іх бацькі, арганізатары творчага спаборніцтва з боку цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк г. Мінска і Саюза пісьменнікаў Беларусі, ганаровыя госці свята — Мікола Мятліцкі, Навум Гальпяровіч — усе яшчэ раз пераканаліся, наколькі таленавіты юныя беларусы.

— Побач з намі — Плошча Перамогі, дзе гарыць вечны агонь у памяць аб мінулай вайне, а ў мемарыяльнай зале мы бачым партрэты пісьменнікаў, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, — зазначыў Мікола Мятліцкі. — Радасна, што цяпер мы жывём у міры і маем магчымасць наталяцца прыгажосцю роднай зямлі. Кожны бачыць Беларусь па-свойму. Але для ўсіх нас яна — адна.

Марыя ЛІПЕНЬ

прызма часу

Малы дакумент — вялікая гісторыя

Некаторым літаратарам патрабуюцца тысячы старонак, каб у мастацкім творы распавесці пра гісторыю той ці іншай сям'і: бацькоў і дзяцей, іх нараджэнне і сталенне, працу і пераезды, стасункі і пачуцці. Афіцыйныя дакументы, сухія, пазбаўленыя эмоцый і адносін аўтара да герояў, могуць расказаць не менш. Асабліва калі гэтыя дакументы становяцца музейнымі прадметамі. Тады іх роля ўзрастае, бо яны дазваляюць скласці жыццяпіс сям'і і вызначыць кірункі далейшых пошукаў.

У фондах Літаратурнага музея Максіма Багдановіча захоўваецца шмат дакументаў, якія звязаны ў першую чаргу з Адамам Ягоравічам Багдановічам, бацькам класіка беларускай літаратуры, а таксама з іншымі прадстаўнікамі роду Багдановічаў. У 1994 годзе фонды музея папоўніліся яшчэ адным прадметам — гэта атэстат Івана Станіслававіча Гапановіча, мужа Магдаліны Ягораўны, роднай сястры А. Багдановіча. Паколькі прозвішча паэта ў дакуменце не згадвалася, а факты датычыліся непасрэдна сям'і Гапановічаў, то дакумент у асноўную экспазіцыю не ўвайшоў, у часовых выставачных праектах удзелу не прымаў. Ён заняў сваё месца ў фондах і на пэўны час, можна сказаць, быў забыты, бо навукоўцы і музейныя супрацоўнікі найперш займаліся вывучэннем асобы М. Багдановіча, яго блізкіх родзічаў.

Сёння супрацоўнікі музея паэта лічаць неабходным пашыраць гарызонты навуковых даследаванняў, раскрываць і сямейныя сувязі, стасункі паміж М. Багдановічам і прадстаўнікамі «беларускай калоніі» ў Расіі — цёткамі, іх мужамі, стрыечнымі братамі, сёстрамі паэта... У гэтым рэчышчы важкасць названага вышэй дакумента ўзрастае, бо ён утрымлівае каштоўную інфармацыю, якая датычыцца сям'і Гапановічаў. Па-першае, даецца працоўная біяграфія Івана Станіслававіча Гапановіча, сябра А. Я. Багдановіча яшчэ з часоў вучобы ў семінарыі. Па-другое, ёсць звесткі пра яго сям'ю.

Такім чынам, з дакумента даведваемся, што Іван Гапановіч паходзіў з сялян, маёнткаў не меў, у 1882 годзе скончыў курс навук у Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі з атрыманнем звання настаўніка пачатковага вучылішча. З 1 кастрычніка 1882 года па 1 кастрычніка 1886 года працаваў настаўнікам Пераж ырскага народнага вучылішча. Нагадаем, што Адам Багдановіч таксама скончыў семінарыю ў 1882 годзе, але быў накіраваны ў Халуйскае народнае вучылішча. Амаль праз два гады, 1 верасня 1884 года, у выніку перамяшчэння ён далучыўся да сябра, але першым пакінуў вёску, а праз год перайшоў на пасаду памочніка настаўніка І Мінскага прыходскага вучылішча.

1 сакавіка 1887 года і Іван Станіслававіч стаў гарадскім жыхаром, але ў сістэме адукацыі больш не працаваў. Ён уладкаваўся ў Мінскае аддзяленне Сялянскага пазямельнага банка канцылярскім служачым. З 30 мая 1889 года працаваў у Дзяржаўным дваранскім зямельным банку, спачатку памочнікам бухгалтара 2 разрада, потым — 1 разрада. З 15 лістапада 1889 года Гапановіч зноў у Мінскім аддзяленні Сялянскага пазямельнага банка, на гэты раз на пасадзе бухгалтара. Верагодна, гэта і ёсць адказ на пытанне, чаму Адам Багдановіч пасля сыходу з пасады настаўніка выбраў працу ў Сялянскім пазямельным банку. Не толькі таму, што шукаў месца, дзе «мог працаваць на карысць народа», як пісаў ён ва ўспамінах. Хто, як не Іван Гапановіч, банкаўскі служачы, муж роднай сястры і стары сябра, мог скласці пратэкцыю. Узнікае наступнае пытанне: чаму А. Багдановіч не застаўся ў Мінску, а паехаў працаваць у Гродна? Ва ўспамінах ён сам даў адказ: «мне абяцалі, таму што была вакансія, але яна была замешчана стаўленікам новапрызначанага кіраўніка аддзяленнем, і мне прапанавалі ў Гродне».

Пасля смерці першай жонкі, Марыі Апанасаўны Багдановіч, Адам Ягоравіч разам з сям'ёй у лістападзе 1896 года пакінуў Гродна назаўсёды. Ён атрымаў перавод на працу ў Ніжагародскае аддзяленне Сялянскага пазямельнага банка. З сабою забраў малодшую сястру Марыю, якая не мела на той час уласнай сям'і, таму магла дапамагчы ў выхаванні дзяцей. Сям'я Гапановічаў засталася ў Мінску, Іван Станіслававіч працягваў працаваць у банку, Магдаліна Ягораўна займалася хатнімі справамі. У Мінску сёстры сустрэліся восенню 1898 года, калі Марыя прыехала ў госці з пляменнікамі Максімам і Львом.

У лютым 1896 года І. Гапановіч атрымаў дзяржаўную ўзнагароду — срэбны медаль «В память царствования императора Александра III» для нашэння на грудзях на Аляксандраўскай стужцы. З 1 жніўня таго ж года перайшоў на пасаду справавода ў Мінскім аддзяленні Сялянскага пазямельнага банка. У адпаведнасці з табелем аб рангах, які дзейнічаў на той момант у Расійскай імперыі, Іван Станіслававіч стаў у 1897 годзе калежскім рэгістратарам, у 1901 годзе — губернскім сакратаром. Выйшаў у адстаўку 1 студзеня 1902 года, звольнены з пасады паводле ўласнага прашэння. У атэстаце Івана Гапановіча ёсць звесткі аб адпачынках. Цікава, што за час працы ў банку ён толькі два разы быў у адпачынку: першы раз — у 1889 годзе (2 месяцы), другі — у 1899 годзе (зноў 2 месяцы, але падкрэслена, што вярнуўся на 6 дзён раней заканчэння тэрміну). З боку кіраўніцтва на яго працу ніколі не было нараканняў.

Звестак аб далейшай кар'еры Івана Гапановіча не маецца, але ёсць інфармацыя, якая датычыцца сямейнага становішча: «жанаты на Магдаліне Ягораўне Багдановіч, мае дзяцей». Ніжэй прыведзены даты нараджэння ўсіх дзяцей Гапановічаў: Вера — 4 лютага 1889 г., Пётр — 2 кастрычніка 1890 г., Ганна — 25 снежня 1892 г., Наталля — 29 красавіка 1895 г., Павел — 21 верасня 1897 г., Барыс — 9 студзеня 1899 г. Падкрэслена, што жонка і дзеці праваслаўнага веравызнання.

Як бачым, невялікі дакумент, які паступіў у фонды музея ад Кацярыны Яўгенаўны Селіваноўскай, унучкі Івана Гапановіча, утрымлівае каштоўныя звесткі да біяграфіі сям'і, якая была побач з Максімам Багдановічам на працягу ўсяго жыцця паэта. Нашчадкі Івана Станіслававіча і Магдаліны Ягораўны сёння жывуць у Санкт-Пецярбургу, Ніжнім Ноўгарадзе, Новасібірску. Яны захоўваюць памяць пра продкаў, збіраюць і перадаюць каштоўныя рэчы з архіва сям'і ў фонды Літаратурнага музея Максіма Багдановіча.

Ірына МЫШКАВЕЦ

Песняй шчырай, вершам сонечным

Бадай, не знойдзеш таго, хто б не быў знаёмы з песняй «Бывайце здаровы». Яна даўно стала народнай. Далёка не ўсе ведаюць, што словы яе напісаў вядомы беларускі паэт-песеннік Адам Русак, а на музыку іх паклаў не менш вядомы кампазітар Ісак Любан. Хоць асабліва здзіўляцца не трэба. Даволі часта асобныя творы жывуць як бы самастойна ад іх стваральнікаў. А тут выпадак, можна сказаць, выключны.

1 студзеня 1937 года тэкст гэтага верша (тады І. Любан музыку яшчэ не напісаў) надрукавала ўсесаюзная газета «Праўда». Пад ім была прыпіска: «Запісана са слоў тав. Русака ў калгасе «Чырвоны араты» Капыльскага раёна Беларускай ССР». З таго часу так сцвярджалася і ў іншых аўтарытэтных выданнях. Народным гэты твор лічыў і выдатны знаўца фальклору, цудоўны рускі паэт Аляксандр Твардоўскі.

Падобнай думкі прытрымліваўся і Міхаіл Ісакоўскі, першы перакладчык верша. А паколькі гэта фальклорная апрацоўка, палічыў ён, пераклад можна ўключаць у свой Збор твораў без агаворкі аўтарства. Пазней ён папрасіў у А. Русака прабачэння. Сёння ж «Бывайце здаровы» выконваюць ва ўсім свеце. Гэтая песня стала і як бы музычнай візітоўкай Беларусі.

Рэдка якому творцу выпадае такая слава, як А. Русаку. На жаль, новае пакаленне ўжо і няшмат ведае пра яго, а лёс жа ў Адама Герасімавіча надзіва цікавы. Каб лепш спазнаць яго, спачатку трэба зазірнуць у сярэдзіну пазамінулага стагоддзя. Тады, пасля доўгай службы ў царскім войску, у родную вёску Пясочнае (цяпер Капыльскі раён) вярнуўся салдат Сямён Русак. Быў ён ужо немалады. Хто ведае, як бы склалася ягонае жыццё, калі б не завітала ў вёску маладая цыганка. Ці не лёсам было наканавана ёй зайсці менавіта ў хату С. Русака?! Прапанавала Сямёну паваражыць. Той, магчыма, і не пагадзіўся б, бо заплаціць за варажбу не было чым. Але вочы цыганкі — чорныя, вялікія — куды больш заваражылі яго, чым нейкія развагі аб заўтрашнім дні.

Хутка і вяселле згулялі. Нарадзілася ў С. Русака і яго маладой жонкі чацвёра сыноў. Усе гэткія смуглявыя, прыгожыя, як і іх маці. У Пясочным і яго ваколіцах іх празвалі цыганкі. Найбольш таленавітым сярод іх быў Герасім. Здавалася, немагчыма знайсці музычнага інструмента, на якім бы ён ні граў. Прагу да музыкі перадаў сваім дзецям, у тым ліку і старэйшаму сыну Адасю, які потым і стаў паэтам-песеннікам.

Адам Герасімавіч (нарадзіўся 24 мая 1904 года ў Пясочным) успамінаў: «Чароўны голас скрыпкі глыбока запаў у маю душу. Скрыпка стала маёй марай з малых дзён. Я часта браў бацькаву скрыпку і сам падбіраў полечкі і кадрылі, а потым з бацькам граў вяселлі і вечарынкі». Музыкам стаў і Адасеў брат Кастусь. Хутка пра сямейнае трыа Русакоў загаварылі на ўсёй Капыльшчыне. Нават прымаўка з'явілася: «Няма цыганкоў — няма і вяселля». Сам А. Русак пра гэта так сказаў у адным са сваіх вершаў:

Без мяне сумуюць госці,
І ўсё гэта нездарма,
Бо ў вяселлі весялосці
Без мяне нідзе няма.

З маленства марыў атрымаць музычную адукацыю. Але паступіў у Мінскі будаўнічы тэхнікум. Пазней з усмешкай прызнаваўся: «Тэхнік з мяне не выйшаў. Я болей хадзіў у тэатры і рэстараны слухаць музыку, чым сядзеў над чарцяжамі, і неўзабаве пакінуў тэхнікум. Едучы ў Мінск, я марыў дзе-небудзь вучыцца музыцы, але і тут у той час не было музычных школ».

У 1930 годзе ўсё ж скончыў Мінскі музычны тэхнікум. Адразу вырашыў працягнуць вучобу, каб атрымаць вышэйшую адукацыю. Паступіў у Ленінградскую кансерваторыю. Адначасова стаў салістам сімфанічнага аркестра Малога опернага тэатра. Кожнае лета прыязджаў у родныя мясціны. Сустракаўся з сябрамі ў Пясочным, а потым кіраваўся ў Малінаўку — гэта непадалёку, кіламетры два, дзе бацькі прыдбалі сабе новую хату.

Асабліва радавалася прыезду сына маці Марыля Ігнатаўна. Яна мела цудоўны голас. Часам, сеўшы на прызбу, хораша спявалі са старэйшым сынам. Калі ехаў яе любімы Адаська ў Ленінград, прасіла: «Сынку, хоць напішы колькі слоў па вяртанні».

Ён на той час ужо не толькі захапляўся музыкай і паэзіяй, але і сам пісаў вершы. Першы з іх «Мая песня» апублікаваў у часопісе «Чырвоны сейбіт» яшчэ ў 1927 годзе падчас вучобы ў музычным тэхнікуме. Неяк, вярнуўшыся ў Ленінград, успомніў матчыну просьбу і вырашыў адказаць бацькам вершаванымі радкамі:

Бывайце здаровы,
Жывіце багата,
А я ўжо прыехаў
Да дому, дахаты.

Першым выканаўцам гэтай песні (а верш менавіта так і ўспрынялі землякі А. Русака) стала Марыля Ігнатаўна. Потым заспявалі яе і іншыя вяскоўцы. Пазней трэці радок крыху змянілі: «А мы ўжо паедзем да дому, дахаты». Між іншым, слынны даследчык беларускага фальклору Іван Цішчанка песні «Бывайце здаровы» прысвяціў кніжку «Жыццё песні» (1984). Ён першым і назваў гэты твор «своеасаблівай карткай беларускага народа, яго песеннага мастацтва». Адшукаў і некалькі ваенных варыянтаў песні «Бывайце здаровы», калі сам народ уносіў у яе тэкст змены, выказваючы нянавісць да фашысцкіх захопнікаў.

Сярод першых выканаўцаў была Ларыса Александроўская. Часта спяваў яе і народны артыст СССР Леанід Уцёсаў. Ён выканаў «Бывайце здаровы» і ў фільме «Канцэрт — фронту» з ваеннымі куплетамі. Пазней прывабіў гэты твор А. Русака Іосіфа Кабзона, знакамітых «Песняроў». У наш час па матывах твораў Адама Герасімавіча Зміцер Вайцюшкевіч падрыхтаваў цэлую праграму.

«Бывайце здаровы» — вяршыня творчасці А. Русака. А ўсяго на яго мастакоўскім рахунку не адна сотня песень. Некаторыя вершы на музыку пакладзены нават двума, трыма, а то і шасцю кампазітарамі. Сярод песень А. Русака — такія, як суровая «Лясная песня» і ўзвышана-лірычная «Беларусь — мая Радзіма», музыку да якіх напісаў Уладзімір Алоўнікаў. «З другам» і «Дняпро» — плён садружнасці з Юрыем Семянякам. Ігар Лучанок стварыў музыку да верша «Дзе ты, зорка мая прамяністая». З А. Русаком супрацоўнічалі Пётр Падкавыраў, Дзмітрый Лукас, Аляксей Туранкоў, Яўген Цікоцкі, Генадзь Цітовіч, Ігар Кузняцоў, Канстанцін Паплаўскі і іншыя кампазітары.

Верш «Бульба» паклаў у аснову аднайменнай харэаграфічнай кампазіцыі лаўрэат Ленінскай прэміі, кіраўнік Дзяржаўнага ансамбля танца СССР Ігар Маісееў. У крыху жартаўлівай форме быў перададзены сам працэс вырошчвання гэтай папулярнай сельскагаспадарчай культуры. Дарэчы, І. Маісееў у 1952 годзе паставіў вакальна-харэаграфічную карцінку «Як той Зосі давялося», па-свойму прачытаўшы адзін з вершаў А. Русака.

Вершы Адама Герасімавіча (як уласна паэтычныя творы, так і тыя, што пакладзены на музыку) неаднаразова перавыдаваліся: «На родных палетках» (1948), «Песні і вершы» (1951), «Толькі з табою» (1960), «Выбранае» (1972), іншыя зборнікі. Як і пераважная большасць паэтаў, А. Русак не забываў і пра дзяцей, аб чым засведчылі ягоныя кніжкі «У Буслаўцы» (1967), «Добра ведаю ўрок» (1981) і «Дружбакі» (1987).

Важны аспект у творах, што ўвайшлі ў іх, — аўтарскае жаданне прывіць дзецям любоў да Бацькаўшчыны. Такую мэту мае і верш «У Буслаўцы». Відаць,

паэт падразумяваў Малінаўку, у якой па сёння захавалася хата, дзе ён у апошнія гады свайго жыцця любіў бываць летам (памёр 21 сакавіка 1987 года). Каб адпачыць, адысці ад гарадскога тлуму. А чаму для верша выбраў менавіта Буслаўку — гэта адзін з сакрэтаў яго творчасці:

Ніхто не знае таго дзеда,
Ніхто яго не ўспамянуў,
Што ў незапамятнае лета
Прыйшоў у нашу старану.

Што працавітаю рукою
Тут першы хату збудаваў
І нашу вёску над ракою
Калісьці Буслаўкай назваў.

Наколькі проста, настолькі і даходліва. Дзіцятка, пачуўшы ад старэйшых гэтыя радкі, безумоўна, захоча даведацца, адкуль з'явілася такая назва вёскі. А таму, што «з даўным-даўна буслы, буслі-цы // Тут гадаваліся, жылі, // Бо ўжо найлепшае сталіцы // На ўсёй акрузе не знайшлі». Слова «сталіца» набывае важкі сэнс. Хлопчык ці дзяўчынка — сумнення няма — запытаюцца ў дарослага, а чаму ж звычайная вёска называецца сталіцай. Тут і трэба ўжо растлумачыць, як любяць птушкі месца, дзе жывуць, гадуюць сваіх дзетак. Тым самым запомняць маленькія і новае для сябе слова. Так А. Русак вырашыў дзве задачы — выхаваўчую і пазнавальную. Дзякуючы, здавалася б, знаёмаму сюжэту.

Адметнасць твораў Адама Герасімавіча для дзяцей і ў тым, што шмат якія з іх напісаны з гумарам. Напрыклад, у вершы «Непаслухмяны Віця». Хлопчыку дома не сядзіцца, ён шукае сабе ўсё новых забаў. І на прыродзе любіць пабываць. Таму «просіць маму, каб пусціла пакупацца ў рэчцы». Тая, занятая сваімі пастаяннымі справамі, вядома ж, баіцца, каб хаця з сынам нічога не здарылася. Заўважыўшы, што ён настойвае на сваім, у роспачы прамаўляе: «Ну, утопішся… тады не прыходзь дамоў».

Маму Віця не падвёў,
Віця не ўтапіўся,
Пакупаўся ды прышоў —
Плаваць навучыўся.

У вершы «Верабей-захопнік» таксама сітуацыя, не сказаць, каб нейкая асаблівая: «Змайстраваў шпакоўню Лёня, // Не шпакоўня — новы дом, // Пачапіў яе на клёне // У садку перад акном». Верабей першым захапіў гэтую хатку і не пускае ў яе шпака са шпачыхай. Хто ведае, чым усё скончылася б, калі б Лёня не стаць «суддзёй» у спрэчцы штушак. Ён шкадуе птушыную сям'ю, таму і гаворыць вераб'ю: «У садку маім павінен // Быць парадак і спакой, // Засяляй сваю кватэру, // Што на хаце пад страхой».

Дыялог у вершах А. Русака набывае важкі сэнс тады, калі маленькі герой у размове з дарослымі ці то адстойвае ўласную пазіцыю, ці то праяўляе кемнасць. Адначасова яму і не чужое пачуццё гумару. Найперш гэта бачна ў вершы «Касманаўт». Сын прызнаецца маці, што робіць ракету і збіраецца ў палёт на зорку. Маці ўдакладняе: «А на небе зорак многа, // На якую паляціш?». І вось адказ:

— Палячу далёка, мама,
Што адгэтуль не відаць,
Да яе, напэўна, будзе
Кіламетраў дзвесце пяць.

Адказ менавіта дзіцячы, непасрэднасць навідавоку. Неабходна быць назіральным, каб так адчуць душу хлопчыка з яго прагай чагосьці невядомага, незвычайнага і разам з тым з уменнем знайсці выйсце з любога становішча. Ты, мама, пытаешся, якую зорку выбраў, а я даўно ўжо ведаю!

Асобныя вершы нагадваюць маналог хлопчыка. У падобным выпадку для аўтара ёсць небяспека збіцца на «дарослaсць». Тады юныя героі некаторых пісьменнікаў гавораць не тое, што дзетак хвалюе і непакоіць, а прамаўляюць прапісныя ісціны, якія з іх вуснаў хацелася б пачуць самім. У А. Русака ж — сама непасрэднасць, шчырасць.

З твораў для дзяцей А. Русаку найбольш удаўся верш «Рыбакі». У ім таксама ў аднолькавай ступені прысутнічаюць выхаваўчыя і пазнавальныя моманты. Паэт вучыць дзетак любіць родны край, знаёміць іх з дарагімі сэрцу мясцінамі. У дадзеным выпадку з Капыльшчынай. Адбываецца гэта са звычайнага маналогу:

Мы з Міхаськам — дружбакі,
Мы з Міхаськам — рыбакі.
Мы як пойдзем — не мінаем
Ні азёраў, ні ракі.

У рыбацкай справе яны дасведчаныя: «На гарох язёў цягаем, // Акунёў на чарвяка. // І няма другога краю, // Як у нас, для рыбака». Пасля гэтага расказваецца пра рэкі, што цякуюць у тутэйшых мясцінах. Тут і Чапля, і Лоша, і Тур'я… І, канешне ж, славуты бацька-Нёман!

Назаўсёды вярнуўся ў сваё роднае Пясочнае Адам Герасімавіч пасля смерці. Яго магіла — на ўскраі вясковых могілак, пад вялікімі дрэвамі. Крыху далей пахаваны бацькі паэта, яго блізкія. Побач з ім вечны спачын пазней знайшла ягоная жонка.

У Песачанскай сярэдняй школе ёсць музей, прысвечаны паэту. На будынку, а таксама на доме ў Малінаўцы і ў Мінску, у якім жыў, устаноўлены мемарыяльныя дошкі. Імя Адама Герасімавіча носяць вуліцы ў Пясочным і Капылі. І працягваюць жыць ягоныя песні. Асабліва «Бывайце здаровы» і «Лясная…», больш вядомая, як «Ой, бярозы ды сосны, партызанскія сёстры». Лёс, якому могуць пазайздросціць нават самыя знакамітыя паэты-песеннікі.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Парог запатрабаванасці

Я не нужен своей ненужностью…
Я простой завалявшийся гений.
М. Мажар

Росквіт запатрабаванасці пісьменнікаў у грамадстве прыпадае на савецкія часы. І Мележ, і Быкаў, і Караткевіч, і Гілевіч, не кажучы пра Купалу з Коласам, нават Сыс з'яўляюцца савецкімі пісьменнікамі. Ці ўдалося б ім спраўдзіцца сёння? Вельмі сумняюся. Яны маглі б быць такімі, як мноства іншых. І наўрад ці выдаваліся за ўласны кошт. Асабіста я перакананы, што і пісьменнікі, і іх кнігі на Беларусі цяпер мала каму патрэбныя. Доказ таму — стаўленне да іх грамадства. І ці выпадкова Юрась Нераток назваў сваю новую кнігу прозы «Непатрэбныя людзі», выдадзеную, між іншым, за ўласныя грошы мізэрным накладам у 70 асобнікаў?..

У творах, што змешчаны ў кнізе, аўтар не прэтэндуе на рэалістычнае адлюстраванне рэчаіснасці і называе іх фантазіямі. Ды, як вядома, у кожнай фантазіі — толькі доля фантазіі, а ўсё астатняе — праўда. Яму балюча

Кожны тэкст, у якім жыццё паўстае ў самых рэалістычных, а таму часта дастаткова змрочных праяўленнях, стварае часам антыўтопію, а часам — наогул дыстопію.

і крыўдна за тое, што адбываецца навокал, ад чаго хочацца збегчы і ніколі не вяртацца. Аднак ці з'яўляюцца панацэяй уцёкі? — вось у чым пытанне...

«Гэта не кніга для знаёмства з усімі тэкстамі запар. Не зборнік для "лёгкага" чытання з мэтай адпачыць і перанесці сябе ў іншы свет, пазбаўлены шэрасці звычайнага дня. Не "фантазіі для стварэння ў свядомасці чытача ўтопіі". Хутчэй наадварот. Кожны тэкст, у якім жыццё паўстае ў самых рэалістычных, а таму часта дастаткова змрочных праяўленнях, стварае часам антыўтопію, а часам — наогул дыстопію. Але героі прыцягваюць

сваёй блізкасцю, а не жаданнем шукаць іх прататыпы ў гісторыях не вельмі адукаваных асоб ці, наадварот, людзей з надзвычай шырокім уяўленнем пра існуючае ў нашым свеце, праблемы з'яўляюцца надзённымі, а не створанымі ў жаданні аўтара быць самым арыгінальным, а сюжэты прымушаюць сачыць за імі напружана і з цікаўнасцю», — кажа ў пасляслоўі да кнігі Бажэна Ганушкіна.

Амаль у кожнай фантазіі аўтара героі не на сваім месцы, яны задыхаюцца ў тых прапанаваных жыццём абставінах і прагнуць іншай долі, іншых часоў, у якіх знайшлі б сябе і сваё шчасце. Ва ўсялякім разе маюць такі спадзеў. Напрыклад, галоўны герой аднаго з найбуйнейшых твораў з назвай «Круты», што мог бы быць аповесцю, — звычайны кандыдат тэхнічных навук, тыповая ахвяра перабудовы, непрактычны і непадрыхтаваны да новых рэаліяў пасля развалу СССР (як і кожны другі з прадстаўнікоў савецкай інтэлігенцыі), будуе машыну часу і вяртаецца ў Савецкі Саюз, дзе яму было добра і ўтульна, дзе разлічвае знайсці супакой і адхланне. Але, маючы досвед жыцця па-за абраным часам, і ў мінулым адчувае сябе лішнім, бо ведае тое, пра што ведаць не павінен, таму адмыслова губіць сябе, намагаючыся папярэдзіць пра нявартыя спробы нешта змяніць. Ні да чаго добрага яны не прывядуць. Ён разумее адну простую да немагчымасці рэч, вядомую, тым не менш, спакон вякоў: усім на ўсіх пляваць, ты ад нараджэння і да канца жыцця адзінокі, асабліва калі маеш уласнае меркаванне.

Нешта падобнае адчувае і герой фантазіі «Няхай Эксвіль нам зайздросціць!» — дысідэнт далёкай будучыні, які не можа ўжыцца ва ўласнай цывілізацыі, дзе забаронена каханне. У якасці пакарання яго высылаюць у наш час. Зразумела, ён тут жа знаходзіць жанчыну і ўлюбляецца ў яе, якая, па нейкім жорсткім і вычварным супадзенні, — таксама прадстаўнік цывілізацыі будучыні, больш за тое — яго кат, бо атрымлівае загад аб утылізацыі каханка. Яна мусіла праверыць мужчыну на здатнасць да эмоцый і пачуццяў, якія катэгарычна забараняліся, а ў ім ледзь не фантанавалі, і таму ён адным сваім існаваннем пагражаў Эліце — той цывілізацыі, прадстаўніком якой з'яўляўся.

«Планета раслін», што знаходзіцца ў далёкім космасе і якой непадзельна ўладараць расліны, — яскравая алегорыя аўтара пра сучасны свет, з якім не існуе амаль ніякай верагоднасці на паразуменне, калі ты сапраўды хочаш і можаш зрабіць нешта вартае і карыснае дзеля яго дабрабыту і праслаўлення. У тры секунды свет гэты робіць цябе расціснутай плямай, а памяць пра цябе сцірае як напісанае крэйдай на школьнай дошцы выказванне пра тое, што чалавек — гэта цэлы свет, бязлітасна абвяргаючы няісную аксіёму.

«Непатрэбныя людзі» — фантазія, што дала назву кнізе, адначасова набыўшы статус рэфрэна і выраку, распавядае пра ахвярапрынашэнне паганскаму богу Марозу паселішчам, якое трапляе на мяжу вымірання. На ролю ахвяры абіраецца найбольш прыгожая дзяўчына, у якасці Снягуркі яе і аддаюць язычніцкаму бажку, замарозіўшы да смерці на крыжы. Так ужо было некалі, калі жаночая прыгажосць аб'яўлялася злом, наўмысным вырабам д'ябла дзеля спакушэння чысцюткіх мужчынскіх душаў, асабліва іезуіцкіх. Сотні тысяч ні ў чым не вінаватых красунь некалькі стагоддзяў запар у імя Бога, жыўцом спальвалі на вогнішчы, крывадушна дэкларуючы, што красуня не памрэ, калі яе прыгажосць ад Бога. Прыгажосць таксама была непатрэбная, бо яе баяліся, як зброі, бо яна і была зброяй, была і ёсць.

Такім чынам, сваімі фантазіямі аўтар падкрэслівае той факт, што ўсё прыўкрасное, сапраўднае, прагрэсіўнае, з творчым пачаткам і верай у эвалюцыю, ва ўсе часы адпрэчвалася, як варожае, ганебнае, небяспечнае і, зразумела, непатрэбнае звычайнаму чалавеку, які павінен быў пакорліва гнуць спіну, бяздумна працаваць на тых, хто літасціва яму гэта дазваляў, трымаючы ў тупасці, у прыгнечанасці, у занядбанасці... Тых жа людзей, якія імкнуліся да ведаў, якія намагаліся адкрыць вочы няўдзячнаму заўжды плебсу праз кнігі, даверлівыя размовы, прыгажосць, праз мастацтва — жорстка пераследавалі і знішчалі фізічна. Ці нашмат свет змяніўся сёння?..

Як часта патрэбныя апрыёры людзі не патрэбныя? Вось пра гэта і кніга Ю. Нераткa. Як папярэджанне. Хочаце вярнуцца назад у макакі — вэлкам!

Мікола АДАМ

Летапіс адчуванняў

Маладым аўтарам часта кажуць, што можна пісаць толькі пра тое, што ты дакладна ведаеш, што сам перажыў і адчуў, таму што толькі так атрымаецца сапраўды шчыры і варты твор. Гэтае правіла зыходзіць з ідэі пра тое, што літаратура, асабліва паэзія, нараджаецца з пачуццяў і эмоцый і накіравана ў асноўным на эмацыянальнае ўспрыманне, а не на счытванне інфармацыі. Таму ў адносінах да паэтычных твораў так часта ўспліваюць словы «глыбока», «шчыра», «тонка» і гэтак далей. Нельга сказаць, што ў гэтых ацэнках ёсць нешта дрэннае, але засяроджанне ўвагі толькі на эмацыянальным складніку адсоўвае ў бок іншыя аспекты паэтычнай творчасці. Складваецца меркаванне, што тэхніка — рыфмы, рытм, стылістыка, кампазіцыя, вобразнасць і іншае — адыгрываюць не такую вялікую ролю, хаця менавіта яны і ствараюць настроі і эмоцыі.

Пісаць пра тое, што дакладна ведаеш, — зразумелае рашэнне, але, паколькі яно накладае абмежаванні на тэматычнае кола, трэба быць вельмі вынаходлівым, каб увесь час працаваць па гэтым прынцыпе і заставацца арыгінальным. Адсюль з'яўляюцца шматлікія побытавыя апісанні ў вершах, вершы-нацюрморты (не такія, як у Бродскага) і захапленне класічным наборам тэм, які закладзены ў галовы яшчэ школьнымі ўрокамі літаратуры, раздзеламі ў падручніках і сачыненнямі: прырода, Радзіма, вайна, каханне, шчасце-жыццё і (са старшых класаў) яшчэ тэма паэта і паэзіі.

У паэтычнай кнізе Людмілы Круглік пад назвай «Пацеркі імгненняў» з гэтых тэматычных патэрнаў складаецца ўся структура зборніка. Паэтка прапускае іх праз сябе і міжволі пераўтварае зборнік вершаў у свой партрэтны нарыс. Справа не толькі ў вершах пра родны горад Дзяржынск і любоў да восені, але і ў дэманстрацыі сваёй пазіцыі па ўсіх пытаннях, якія па традыцыі павінны цікавіць паэта. Большасць тэкстаў напісана ад першай асобы, у іншых прысутнічае вельмі канкрэтнае аддзяленне лірычнага героя ад аўтара — у сюжэтных вершах, перасэнсаваннях паданняў і прысвячэннях. Зразумела, што звычайнае выкарыстанне першай асобы ў вершы не абазначае тоеснасць аўтара з лірычным героем, але ў выпадку, калі думкі перацякаюць з верша ў верш, можна зрабіць такую выснову. Яе ж пацвярджае прадмова да кнігі, аўтарка якой абазначае, што ў вершах Людмілы Круглік можна ўбачыць «гэтую "чырвоную нітку" жыццёвых высноў, якую паэтка ўжо моцна трымае ў сваіх руках і стараецца не згубіць яе, а яшчэ больш разматаць з жыццёвага клубка». Так у аўтара атрымліваецца ўласны летапіс адчуванняў і адкрыццяў.

Цярплю... Зноў у зале чакання
Жаночае шчасце шукаю...
Гудок... Я бягу на спатканне.
Выходзіць з вагона... Вітаю.

У такі дзённік трапляюць толькі ўрыўкі падзей, знакі і дэталі, якія нагадваюць пра далёкія часы, эмоцыі, перажытыя некалі. Зразумела, што складана напісаць цэлы зборнік вершаў толькі пра сябе, але можна сказаць, што кожны тэкст дапаўняе вобраз жанчыны, якая хаваецца за ім, бо расказвае так ці інакш пра частку яе жыцця — або асабістую, або пра факты і творы мастацтва, якія паўплывалі на аўтарку і замацаваліся ў яе асобе. Нягледзячы на тое, што ў многім зборнік «Пацеркі імгненняў» — гэта расповед пра жыццё чалавека, у празаічнай форме ён бы зусім не атрымаўся, бо вершаваная форма сама па сабе з'яўляецца канцэнтратам эмацыянальнага ўспрымання: маленькі памер, рытмічнае паўтарэнне пэўных частак слоў — гэта ўсё мае ўплыў на чытацкую псіхалогію. Таму жаданне рэфлексаваць пра сваё жыццё менавіта ў вершаванай форме зусім не здзіўляе. Аўтарка і сама тлумачыць сваю матывацыю:

Калі надвячоркам самота
Трымае ў палоне душу,
Аловак бяру і з ахвотай
Кранальныя вершы пішу.

І ўвесь зборнік пацвярджае гэта — вершы ў дадзеным выпадку маюць тэрапеўтычны эфект для аўтара, дапамагаюць справіцца з пачуццямі або апісаць уражанні.

Людміла Круглік абірае традыцыйную форму паэтычнага паведамлення: знаёмыя кожнаму рыфмы, аднародны рытм. Аўтарка робіць усё для таго, каб яе можна было лёгка зразумець. Можна зрабіць выснову, што яна захапляецца беларускімі класікамі і імкнецца вучыцца ў іх. Гэта заўважна не толькі па тэхнічных і тэматычных асаблівасцях яе твораў, але і па вялікай колькасці прысвячэнняў і пераасэнсаванняў, якія прысутнічаюць у зборніку. Аўтарка намагаецца наладзіць міжчасавую і міжпрасторавую камунікацыю з Уладзімірам Караткевічам, Максімам Багдановічам. У некаторых вершах побач з яе думкамі гучыць голас Янкі Купалы.

На шляху ад Нясвіжа да Мінска
Ёсць прыгожы пагорак лясны,
Як юнак да каханае, блізка
Прытуляўся там дуб да сасны.

Адзін з асноўных матываў творчасці Л. Круглік — гэта успамін. У яе тэкстах шмат разоў узнікаюць сімвалы маці, дзяцінства, юнацтва, некалькі разоў сустракаецца вобраз часу, які гартае старонкі жыцця. Уяўляючы сваё жыццё як кнігу, аўтарка імкнецца на самай справе перанесці яго на старонкі: пра ўспаміны — урыўкамі, пра каханне — намёкамі, пра роднае і блізкае — з захапленнем.

Аўтар размаўляе пра знаёмыя рэчы на зразумелай мове. Такія творы звычайна пішуцца выключна для сябе, але знаходзяць водгук у сэрцах тых, для каго таксама актуальныя падобныя думкі і перажыванні. Такім чынам, атрымліваецца, што аўтар наўпрост размаўляе з чытачамі, блізкімі па духу. Размыванне межаў паміж лірычным героем і аўтарам, а таксама скарачэнне дыстанцыі паміж аўтарам і чытачом — сучасныя тэндэнцыі, у многім звязаныя з інтэрнэт-прасторай, але ў дадзеным выпадку гэтая сувязь рэалізоўваецца праз кнігу — на нейкім вышэйшым узроўні.

Дар'я СМІРНОВА

Шчодры ўмалот



Яшчэ ў XVIII стагоддзі нямецкі літаратар і тэарэтык-асветнік Г. Э. Лесінг адзначаў сувязь лірыкі і выяўленчага мастацтва. У сваёй грунтоўнай працы «Лаакаон, ці Межы жывапісу і паэзіі» на прыкладах антычнай культуры ён пераканаўча пацвердзіў выказванне Вальтэра пра тое, што «жывапіс — гэта нямая паэзія, а паэзія — гэта жывапіс, які прамаўляе». Уздзеянне высокага слова і намаляванага вобраза шмат у чым падобныя: і першае, і другое «…паказваюць нам адсутныя рэчы так, нібыта яны знаходзяцца паблізу, бачнасць пераўтвараюць у яву, адно і другое ашукваюць нас, і ашуканства абодвух прыносіць задавальненне».

Таму нездарма сярод мастакоў так шмат паэтаў, і наадварот. Жывапісец, адчуваючы, што застаецца нешта недавыказанае ў карцінах, бярэ на ўзбраенне слова; паэт, натыкаючыся на межы, дзе заканчваюцца магчымасці мовы, пачынае маляваць.

Творчасць вядомага беларускага графіка Рыгора Сітніцы якраз спалучае у сабе два напрамкі. Дуалізм гэты натуральны: паэзія сталася лагічным працягам адкрыццяў, зробленых у жывапісе. З другога боку, літаратура дапамагала (і дапамагае) мастаку выяўляць не толькі свой унутраны стан, але і выказваць грамадзянскую, чалавечую пазіцыю.

Летась у выдавецтве «Чатыры чвэрці» выйшла кніга, якая сабрала пад сваёй вокладкай вершы, створаныя Рыгорам Сітніцам на працягу творчага жыцця. Яна мае красамоўную, арыгінальную назву: «Ток».

Ёмістае, выразнае слова надзвычай адпавядае зместу зборніка. Найперш гэта азначэнне энергіі, сутнасці жыцця: ток крыві, а таксама электрычныя імпульсы, што стымулююць нейроны мозгу, актывізуючы працэсы мыслення і творчасці. І канечне, «ток» у беларусаў — месца, дзе адбываецца абмалот зерня, дзе падсумоўваецца плён чалавечай працы, дзе становіцца зразумелым, якім працавітым і дбайным быў гаспадар, ці якасным было насенне і ці ўрадлівай глеба.

Такім чынам, «Ток» — гэта своеасаблівая паэтычная справаздача за гады насычанай творчай дзейнасці. Але ж акрамя ўласна выяўленчага мастацтва, Рыгор Сітніца рэалізаваўся і як грамадскі, культурны руплівец, публіцыст. Усё гэта паспрыяла фарміраванню выразнага крэда, якое знайшло адлюстраванне ў паэтычным слове:

П'едэстал, трыбуна ці турма,
Кайданам блішчэць ці эпалетам —
У паэта выбару няма,
Акрамя як толькі быць паэтам.
(з верша-прысвячэння Г. Бураўкіну)

Рыгор Сітніца — адэпт класічнай беларускай традыцыі. І ў некаторых вершах ён свядома крочыць сцежкамі, пратаптанымі папярэднікамі, не баючыся паўтарыцца:

Стамлёных аблокаў смуглявая млявасць
Плыла спаквеля па блакітным авале
Балтыйскага неба;
а сонца і хвалі
Кахання свайго ад людзей не хавалі;
І промні ваду цалавалі, і хвалі
Люлялі ў лагодзе шчаслівае сонца…

З-за пляча аўтара ў гэтых радках пазнавальна выглядваюць і багдановічаўскі «сінякрылы матылёк», і барадулінскае «лілею млявы плёс люляе …». Рыгор Сітніца смела эксперыментуе з алітэрацыямі і гукапісам яшчэ і таму, што не саромеецца вучыцца, на практыцы засвойваць «паўтарыцельны курс» не толькі беларускай, але і сусветнай літаратуры.

Першы раздзел зборніка «Доўгае рэха» ўспрымаецца як праграмны, у ім знайшлі сваё адлюстраванне і творчае крэда, і даніна павагі майстрам айчыннага пісьменства, а таксама глыбокі роздум над лёсам Айчыны, над прызначэннем высокага мастацтва ў сучасным грамадстве.

Місія паэта — быць прарокам на сваёй Радзіме, няхай нават непрызнаным і выгнаным. Мабыць, таму Рыгору Сітніцу вельмі блізкая творчасць І. Бродскага, месцамі ён цытуе знакамітага паэта, а некаторыя вершы, напрыклад «Парад пераможцаў» ці «Калядны дывертысмент», відавочна, створаны пад яго непасрэдным уплывам.

Пра тое, як няпроста творцу існаваць у соцыуме, падпарадкаваным нібыта адзіна правільным мадэлям паводзінаў, сведчаць і такія радкі:

Не любы мне словы «направа», «налева», «руш»,
І колеру хакі вопратку я не люблю.
(«Дэкларацыя пацыфістага»).

Вобраз паэта, адрынутага і зняверанага, набывае працяг і ў такім вершы:

Фотаздымкі Купалы трыццатых гадоў —
Зацкаваных вачэй скамянелы пагляд —
Гэта роспач усіх курапацкіх удоў,
Дзе пустэльня — наперад, пустэча — назад…
[……]
Пустата — Варкута, пустата — Калыма,
Пустата — гэта ўсе, каго болей няма…

Але ж пасля душэўных згрызот, пасля паняверкі і адчаю ёсць надзея ацаліцца гаючым словам сябра, яго неўміручым радком:

І калі спадзяванняў ніякіх
на гэты свет перакулены
Не знаходзіць душа, здаецца, —
ды дзякую, Божа,
Што мажлівасць простая ёсць —
пазваніць Барадуліну…
Ён дапаможа.

Другі раздзел зборніка — «Канцэрт для скрыпкі і завірухі» — сведчыць пра тое, што Рыгор Сітніца — яшчэ і надзвычай чуйны лірычны паэт, які здольны ў звычайнай з'яве прыкмеціць будучы паэтычны вобраз, а з імгненнай думкі-згадкі выснаваць сюжэт для верша. Як і для кожнага творцы, для Рыгора Сітніцы менавіта каханне — невычэрпная крыніца натхнення, выток усіх мар і спадзяванняў:

Як найлепшы самы
з маіх закаханых вершаў,
Я табе прысвячаю
чэрвеньскі гэты дождж.

Раздзел наскрозь працяты мелодыямі, гукамі, рытмамі. Музыка — гэта яшчэ адна сімпатыя аўтара. Вершы «Раманс», «Пад гукі катрынкі», «Сола для вулічнага саксафона», «Блюз начнога дажджу» — незвычайныя па пачуццёвай і метафарычнай напоўненасці. Бо —

Ёсць музыка глыбінь, і цвердзі, і нябёс.
Яе спасцігнуць, як уласны зведаць лёс.
Разгубіцца душа на ростанях дарог —
Ёй шлях пакажа Бах, а гэта значыць — Бог.

Як ужо было адзначана, Рыгор Сітніца не баіцца паўтораў у паэзіі, таму і такі верш, як «Віно дажджоў» не выглядае ні перайманнем, ні эпігонствам, а найперш — данінай павагі, паклонам знакамітаму аўтару арыгінальнай «малой паэмы». Гэта ода сяброўству, ода вернасці ідэалам:

Захмялелай сябрынаю
будзем сядзець, гаманіць давідна,
Безназоўнаму часу надаўшы найменне «Віно дажджоў».

Паэт — вечны рамантык, «дзіця з вачыма празарліўца» (Р. Барадулін), безабаронны ў сваёй наіўнасці, які кожны дзень пачынае жыццё наноў, бо толькі так можна захаваць чысціню і непасрэднасць успрымання. Дзеля чаго ж яшчэ імкнуцца жыць менавіта так — не патрапляючы ў плынь, не падладжваючыся пад меркантыльны, прагматычны свет? Бадай, дзеля гэтага —

Каб я ўрэшце спасціг, зваяваўшы свае ветракі,
Што каханню пад сілу з нябыту вяртаць цягнікі.

Астатнія два раздзелы зборніка — «Усходні вецер» і «Трысвечнік» адлюстроўваюць імкненне аўтара пафіласофску асэнсаваць жыццё, спасцігнуць вечныя, духоўныя каштоўнасці. Нездарма Рыгор Сітніца звяртаецца да класічнай японскай вершаванай формы хоку, лаканічнасцю і выразнасцю гранічна набліжанай да жывапісу, дзе ў трох радках ствараецца яркі, запамінальны філасофскі вобраз, накшталт:

З нетраў сутоння
Ружовы расцвіў ліхтар.
Начная кветка.

Сімвалічна, што паэма «Знак перасцярогі» — фінальны, надзвычай эмацыянальна насычаны твор зборніка — якраз завяршаецца радкамі, што сустракаюць чытача на пачатку кнігі, своеасаблівым чынам закальцоўваючы час, яднаючы мінулае і сучаснасць:

…І з вуснаў злятае,
І чуюць мурог і мураш:
«Ойча наш…».

Як сапраўдны мастак, Рыгор Сітніца ўмее ўгадваць і прадбачыць коды быцця, вышукваць знакі і падказкі ў блытаным і цьмяным мораку паўсядзённасці, спрабуе зразумець, «пра што гаворыць птушыны клінапіс на снезе белым», якія таямніцы давяраюць нам «…поле, сцяжына, камень»… Ён стварае свой сусвет, у якім дзве магутныя стыхіі — жывапіс і паэзія — гарманічна суіснуюць, утвараючы адно цэлае, непадзельнае, як само жыццё.

Янка ЛАЙКОЎ

І пах сунічны, і ліст зялёны...

Захапленне краявідамі роднага краю, шчымлівыя, глыбокія і яркія пачуцці жаночай душы, скрушныя развагі, навеяныя ўсведамленнем непапраўнасці наступстваў чарнобыльскай катастрофы, спробы расставіць для сябе ўсё кропкі над «і» ў няпростай карціне ўзаемадзеяння чалавек — сусвет альбо чалавек — людзі, — асноўныя матывы першага зборніка паэзіі Наталлі Алейнікавай «Ажыццяўляюся табою...», які летась пабачыў свет у выдавецтве «Коларград». «Задума назвы ў тым, каб перад чытачом разгарнулася кніга так, як перад аўтарам разгарнуўся Сусвет з яго прыродным хараством», — пазначана ў анатацыі. Гэта, а таксама аўтарскія пейзажы, багата змешчаныя на старонках выдання, — усё працуе на ідэю зборніка і настройвае чытача на рамантычны лад, — менавіта на такіх хвалях гучыць голас натхнення лірычнай гераіні.

Адметна, што спявае душа аўтара на дзвюх мовах: па-беларуску (усяго 3 раздзелы выдання) і па-руску (астатнія 6, прыкладна дзве трэці аб'ёму). Але чысціня голасу, тэмбр, глыбіня пачуцця і арыгінальнасць, свежасць успрымання не паўсюль аднолькавыя. Верагодна, гены продкаў, глыбока закладзеныя ў кожным, хто нарадзіўся тут, на гэтай зямлі, покліч яе мінуўшчыны — як тыя зернейкі, што стагоддзі ляжалі ў пясках, але прыйшоў час — і буйна ўскаласіліся... У кожным вершы першых частак — малады дзёрзкі запал, адкрыццё, нягледзячы на тое, што ўсе вобразы — з роднага беларускага поля: і бусел, і восеньскі ліст, і родныя палеткі, далёкія зоры і блізкі лес...

***

Казалі мне —
гармоніі няма,
яе ты не шукай нідзе
у гэтай долі.
А я яе, сябры,
знайшла сама —
у жытнім полі,
і ў срэбранай вадзе
крынічнай,
яна — і пах сунічны,
і ліст зялёны,
што на волі,
яна і
ў канюшыны
цвеце.
Паўсюль,
паўсюль
у свеце...

Так і ёсць. Адчуваннем гармоніі напоўненыя і вершы маладой паэтэсы. Нават калі яна гаворыць пра развітанне, сум і тугу. Мова — разняволеная, лірычная гераіня прамаўляе, не задумваючыся аб тым, правільна гэта гучыць ці не. Як дыхае. Вось трапіла ў верш адметнае слоўца, якога няма ў акадэмічных слоўніках, але людзі яго ужываюць: пуцінка. Так называюць несартавыя яблыні (якія растуць пры дарозе) і іх плады. У пераважнай большасці апісальных вершаў адразу відаць карцінка, чытач нібы сам апынаецца сярод лесу, каля возера ці балота, дзе

...качка схавала малых
у чароце.
Чую, як пляскае з рыпам
вясло...

Ёсць вершы, дзе аўтар ужывае, здавалася б, збітыя рыфмы, якіх майстры слова імкнуцца пазбягаць, але гэта не замінае творам гучаць па-новаму, чыста і адметна:

Цвіце чаромха, дзіўны пах,
расплюшчыў майскі вечар
вочы,
узлезу ціхенька на дах,
каб паяднацца з цудам ночы
і быць да дальніх зор бліжэй...

Што датычыць рускамоўнай часткі зборніка, большасць яе вершаў выглядаюць так, быццам яны напісаныя не цяпер, у XXI стагоддзі, а недзе ў XIX: усё гэта даўно ўжо было сказана. Найбольш удалая хіба спроба разняволіцца, калі аўтар не прытрымліваецца традыцыйнай вершаванай формы, хаця прысутнічаюць і рыфма, і рытм. Творы, якія атрымаліся, балансуюць на мяжы паэзіі — проза: некаторыя вобразы яркія, маляўнічыя: «...Осень, не капризничай теперь. Выплакав взъерошенную душу без смущенья, прихотям взамен, пожелание моё и ты послушай, — вызолоти рваный гобелен!» Відаць, што вобраз восені найбольш блізкі лірычнай гераіні. Гэта — матывы холаду, расстання, расчаравання, пачуцці, якія калісьці грэлі, а цяпер прайшлі, пабляклі. У такія моманты згадваецца міф пра тое, што шчаслівыя вершаў не пішуць.

...В сердце блуждают
ночные ветра,



словно им мало
объятий Земли.
Словно Вселенная
хочет меня
соединить с бесконечностью
мира;
словно однажды
сотрутся слова
те, что тебе я
наговорила…

Верш, якім завяршаецца зборнік, — бадай, найлепшае таму пацвярджэнне: з эмацыянальнай дакладнасцю апісана тое, што адчуваеш, калі страчваеш нешта блізкае, дарагое.

Яна БУДОВІЧ

Васіль ЗУЁНАК

***

Не кувай ты, шэрая зязюля…
Максім Багдановіч

Паміраў і думаў: “Не самотны…
Кніжку маю ад Марціна Кухты…”
Толькі шлях — як вырак — незваротны
Быў да родных ніў ад Сіняй бухты…

Завязаў вянок дарогу лёсу:
Колькі ні ідзі — усё па крузе…
Ападае палатно на росы —
Беліць кужаль недзе там на лузе.

А ў яго — асноваю і ўтокам —
Тчэцца год за годам, і тканіна
Высцілае ў вечнасць шлях далёкі:
Маці Беларусь чакае сына.

А ці дачакаецца — не знае.
І не прыляціць куваць зязюля.
І сыны астатнія гадаюць:
А ці твой грудок там агарнулі?..

Як вясной назначана…

Ці паверыце, ці не:
З небам я дамовіўся!
Ладам сёння ўсё ў мяне
І па-веснавому ўсё.

Ці то ўдзень, ці то ўначы
Ў добрай згодзе з Начаю
Ўся прырода правіць чын,
Як вясной назначана.

Бусел мерыць паплавы
Крокамі дзяржаўнымі.
Ап’янеў ад сінявы
Сейбіт песень — жаўранак.

З-пад вясёлае рукі
Пазірае сонейка,
Як цяпер цецерукі
Дзеляць у сасонніку.

Яблыня — царыца дрэў —
Квеціць наваколле ўсё.
Пасля сцюжы на сугрэў
Кот прычастаколіўся.

Дождж прайшоў…

Дождж прайшоў, прашумеў, адліўся,
Ручаінамі збег у нізіны,
Сяміграйнай вясёлкай абвіўся
І на вуліцы гулкай пакінуў:

Дарослым — разважлівую асцярожнасць:
Абыходзіць лужы здалёку,
Малым — вясёлае басаножжа:
Бесклапотна па лужах галёкаць.

***

Дзень пражыты — нібыта вечнасць —
Па касмічных мерках ляціць…
Як зямныя раны залечваць,
Майце досвед — мудрэй не знайсці!

Калі час да сценкі прыцісне,
Спосаб ёсць пазбыцца жуды:
Азірніцеся на дзяцінства —
І глыніце жывой вады.

***

Дапытліваму небу

Мільён тваіх пытанняў —
А мы без перамен, —
Ці адказаць не ў стане
На твой эксперымент?

Бо то ж з якой патрэбы —
Хіба дзеля акрас? —
Дапытлівае неба,
Ты зорышся на нас?..

***

Як мудра ўсё ж, што ўдзень не бачна зорак, —
Хоць нейкі перапынак для душы.
І ноч даецца, пэўна, каб з дакорам
Усё, што дзень прынёс, не варушыць.

Ды неба паўстае перад вачыма,
Каб вестку неадступную падаць,
Што зорны свет спасцігнуць немагчыма,
Як немагчымае жыццём не разгадаць.

***

Слоў не бывае выпадковых.
Маўчанне тайны ў кожным з іх.
Сэнс адкрываецца нанова,
Як з небыцця, для нас, жывых.

У кожным слове Усявышні
Нам ад патомкаў голас шле.
Ніхто ў той повязі не лішні —
Дух Боскі не згасае ў тле.

Слоў выпраменьванне ў Сусветы
Ляціць як покліч наш зямны, —
Няхай без водгуку, ды з мэтай:
Пакуль ёсць слова, ёсць і мы.

Нашы душы…

Што не вадзіца,
А роднай зямліцы
Кроў, —
Няўжо, асуджаныя
Забыцца
Рэчышчы
Нашых Дняпроў?..

І нашых Дзвінаў
Адзіны
Да Бога раздвойвацца шлях
Будзе ўзмахам кадзіла —
“Присно” — “днесь и в веках”?..

І Нёманы глуханямыя
Сплывуць да чужых рубяжоў —
І няўжо
Акіян нашу мову размые
І памяць заглушыць?..

Зноў і зноў пытаюся ў вас,
Нашы душы:

— Няўжо?!.

22 чэрвеня: Сёння, тады, назаўсёды…

“Вы не забыліся, што пачалося?..” — пытанне з паэмы лёсу “Маўчанне травы”…

І ў ценях імглістых усход,
І сонца не бачна вячэрняга,—
Спраўляе дум умалот
Дваццаць другі дзень чэрвеня.

Праходзіць ён не па-летняму,
Зусім не так, як тады,
Калі цеплыня ў апраметную
Свае кіравала сляды.

Няма супадзення ў прыродзе,
Няма пастаянства акоў.
А памяць — нязменна прыходзіць
І за мяне, й за бацькоў.

Калі было ўсё абманліва
І знаць не зналі ні я,
Ні свет пра пакуты глабальныя, —
Такая была цішыня.

Быў з летнімі абавязкамі
Дзень сённяшняму з радні,
Быў — сённяшняму падказкаю:
Не вер цішыні!..

Сосны

Гамоняць з ветрам сосны,
Майго юнацтва сёстры,
Аб днях, у вечнасць зніклых,
Калі я быў вялікі,
Стаяў між іх, сасёнак,
Што выраслі з пялёнак,
Ды ў кволым пакаленні
Былі мне па калені…
А сёння перад імі
Хто я — пры іх уздыме?!.
Бор неба падпірае,
Паглядам вымярае
Мяне: няўжо той самы? —
І з ветрам вытрасае
Мне юныя ўспаміны
І, пэўна, прыпасае
Сасну на дамавіну…

Сустрэч не будзе…

А там ніхто й нідзе не заблукае,
Ніхто й нікога не сустрэне там, —
Як рай турэмных, адзіночных камер,
Сусвет прарокі абяцаюць нам.

Сустрэч не будзе, — у Святым Пісанні
Абвешчаны смяротнаму прысуд.
Прастора й час не ведаюць згасання —
Яно для нас як шлях зямных пакут.

Усіх чакае зорная магіла
І нерухомай вечнасці палёт,
І ў душы будуць угрызацца крылы
Не для сустрэч — для зорных адзінот.

Аргумент

Да спрэчкі аб тым, дзе шукаць “Цэнтр Еўропы”

— І куды я залез?! —
Пытаецца бот мой атопак: —
Гэта ж не лес,
А натоўпы!

— І куды я зайшоў? —
Бота свайго
Паўтараю. —
Дзесяць кашоў
Аднаго
Грыба
Збіраюць!..

Там, дзе быў неруш,
Спрэс
Машыны патопам.
Цяпер і паверыш:
Наш лес —
Цэнтр Еўропы!

Весела!..

Мужчыны — без прычыны,
І бабанькі патроху, —
Вясёлая эпоха,
Эпоха-выпівоха!..

Конкурс «ПЕРШАЦВЕТ»

Студэнт 2 курса аддзялення класічнай філалогіі філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта. Уваходзіць у факультэцкі літаратурны гурток «Альтанка». Лічыць, што для паэта галоўнае не сказаць, а ўбачыць. Паэзія для яго — позірк сусвету ў люстэрка.

Мікіта ВАРАНЦОЎ

Вялікая элегія Максіму Багдановічу

Паэты птушкамі
Лятуць на Парнас,
Ды ў лёса
Заўжды хопіць патронаў...

Толькі зараз пабачыў
Колькі іх на зямлі,
Але першым
Я ўбачыў цябе, Максіме.

...Што было б, калі б ён не памёр юнаком?
Яго б расстралялі. Потым...

У яго галаве
Танчылі б німфы разам з сацірамі,
Анёлы б гралі на антычных арфах,
Мадонна зрывала б з нябёсаў
Расквітнелыя зоркі.
Увесь гэты чароўны свет
Працяла б куля.

Ён бы ўпаў на зямлю.
На зямлі б валяліся аскепкі санетаў і актаваў,
І сцякалі б струменьчыкі крыві,
Як радкі апошняга верша.

Хочацца верыць,
Што ёсць рай для забітых паэтаў,
Дзе ім дадзена вечнасць
Каб дапісаць недапісанае;
І што ёсць пекла для іх катаў,
Дзе на іх распаленымі літарамі
Пішуць радкі,
Якія не паспелі напісаць іх ахвяры.

Але тыя чырвоныя радкі
Прарастуць з зямлі
Дрэвамі — вершамі.

І вечнае неба будзе
Між іх радкоў.

Занатоўкі на палях захаду

*

У імгненняў — прысмак солі.

*

Сонца — буёк,
За які не заплысці нікому.

*

У дзяцінстве
Я лічыў мора сваім верным псом,
Што ліжа мне пяткі
Языкамі хваляў.

Цяпер жа,
Пабачыўшы мяне праз столькі гадоў,

Хвалі бягуць да мяне,
І я вітаю іх
Як добрых сяброў.

*

Хвалі падымаюць з дна мора
Думкі і вердыкты аб жыцці.

Я падбіраю іх —
Аскепкі шкла —
І кідаю назад у пену,

Ды яны зноў вяртаюцца
Да маіх ног.

*

Мора падмірґвае мне
Сонцам на захадзе
І ўсміхаецца хваляй.

Я ўсміхаюся ў адказ.

*

Мора!
Навучы мяне зноў
Усміхацца.

Ранішні аўтобус

Галава — келіх,
Напоўнены сном.
Трымаюся за поручні,
Каб не разліць.
У келіху адлюстроўваецца
Ранішняе неба.

У небе — парэшткі ночы.
Раніца нясе іх
На залатых штыках.
Сонца з трыбуны гарызонту
Крычыць на свет новы дзень.

Чаму крычыць?
Я прыглядаюся:
Неба чырвонае ад плачу.
І ўспамінаю:
Ноччу была залева.

Аўтобус пляцецца па сырым асфальце.
Струмені вады
Бязлітасна вымываюць
Пазваночнік дарожнай разметкі.

У лужынах — неба.
Аўтобус апырсквае мінака
І ён адцірае нябёсы
Ад курткі.

Мікола ЧАРНЯЎСКІ

КАНЬЯК З РАЗЬБОЙ

Апавяданне

Мінула ўжо добрых паўстагоддзя, а далучэнне да «каньяку з разьбой» памятаю, нібыта было ўсё толькі ўчора. Нават ведаючы, што з удзельнікаў той пачосткі працягваю хадзіць па нашай зямельцы я адзін. Астатнія трое — ужо там, пад крыжамі…

…Не ведаю, як яно атрымалася, кім спланавалася, але ўвесь наш вясковы, як цяпер кажуць, культурна-грамадскі цэнтр размясціўся на самым ускрайку вёскі. Там, дзе з галоўнага шляху адна дарога брала ўлева, у бок райцэнтра, на Буда-Кашалёва, а прамая праставала далей у палявы прасцяг, забягаючы ў Негаўку, а яшчэ праз дзясятак кіламетраў — у мястэчка Рагінь, бліжэй да шашы… Можа, таму, што гэты ўскраек вёскі выдаўся крышку вышэй над узроўнем нашай выпрамленай і змялелай рачулкі Ліпы, быў узгорыста-пясчаны і сушэйшы, ён стаў найбольш прыдатны для вясковага пагосцішча, дзе знайшлі вечны спачын мае дзед Сяргей і баба Проса, а таксама бацька, маці, старэйшы брат Міша… І, мабыць, каб не так журботна і самотна пачувалася там насельнікам гэтага боскага прытулку, ужо на маёй памяці выраслі непадалёк яго магазін, пошта, сельсавет, школа, а найбліжэй — клуб. Здаралася, на Радуніцу, добра разгавеўшыся на памінках продкаў, мужчыны з могілак тлумным гуртам завальваліся ў гэты самы «асяродак культуры» і, распудзіўшы па кутках моладзь, пад клубны баян ці радыёлу пускаліся ў скокі. Гулка гарцавалі і шоргалі па падлозе кірзачамі, самым дзейсным чынам падмацоўваючы праўдзівасць народнай прымаўкі «На Радуніцу да абеду плачуць, а пасля абеду — скачуць».

Ад усёй «інфраструктуры» з аднаго боку і ад поля — з другога пагост адгароджвала даволі-такі глыбакаватая, парослая розным зеллем, канава, нібы праводзіла мяжу паміж тым светам і гэтым.

…Прыехаўшы раніцою дадому ў адпачынак і пасядзеўшы нейкі час з бацькам і мачыхаю за сталом, я вырашыў падацца «на дзярэўню», як у нас казалі жанкі. Я ж кіраваўся туды перш-наперш з разлікам сустрэць каго са сваіх равеснікаў ці былых аднакласнікаў, а выпадзе нагода — дык і ў сельмаг завітаць — бадай, самае бойкае месца ў вёсцы. Сюды падыходзілі і пад'язджалі на «лісапетах» ці калгасных машынах, тут гуртаваліся, скідваліся хто па колькі ды перабіраліся праз дарогу каму на лаўку ці ў двор, каб не надта кідацца ў вочы, вясковыя тусоўшчыкі, дзе па-братэрску дзяліліся прыкупленымі кроплямі.

Менавіта каля магазіна напаткаўся мне ў той раз Шурык — стрыечны брат майго школьнага таварыша Вані Кавалькова, які пасля школы з'ехаў на вучобу ў далёкі расійскі горад Тулу, да старэйшага брата Лёні. Што Шурык збіраўся купляць, я не ведаю, але стаяў на ганку магазіна ў нейкім одуме. Можна было падумаць, што ён выйшаў, каб сустрэць мяне. Заўсёды рухавы і вясёлы, ён і цяпер, шырока ўсміхаючыся, падаўся насустрач, здароўкаючыся, моцна паціснуў руку — як па маладосці робіць кожны, каб паказаць сваю несумненную дужасць. Я ведаў, што пасля школы ён нікуды з вёскі не з'ехаў, да таго ж не роўна дыхаў да маёй былой аднакласніцы, малодшай сястры нашага ўчастковага міліцыянера Івана Сямёнавіча, нават збіраўся згуляць з Любай вяселле. Таму пагаварыць нам было аб чым, навін у яго, як мне думалася, набралася процьма.

Канечне, ганак магазіна не лепшае месца для сяброўскай размовы, таму я прапанаваў:

— А давай я вазьму бутэльку, ды пойдзем пасядзім дзе-небудзь?

— Няма тут чаго браць, адзін «сухач» на паліцах стаіць. Жніво ж пачалося, а падчас уборкі — сам ведаеш…

Як не ведаць?! Кожнае лета, як надыходзіла жніўная пара, згодна з суровай пастановай раённых уладаў, усім вясковым крамам забаранялася гандляваць моцнымі напоямі. Мала чаго яшчэ можа здарыцца ў такі гарачы час, калі чалавек знаходзіцца нападпітку?! Таму бітва за ўраджай, як пісалі тады газеты, у мясцовага начальства нярэдка пераходзіла ў бітву з гэтым самым не заўсёды пераможаным «змеем». Насуперак суровым інструкцыям і папярэджанням зверху да паўночы гойсалі шафёры па знаёмых «яўках», спальваючы вёдры бензіну, у пошуках іншага «гаручага». Праўда, паліва тады каштавала не так адчувальна, як цяпер, ніхто не драў за яго, як цыган за бацьку, таму некаторыя, каб фіктыўна павысіць норму выпрацоўкі, салярку нават у канавы злівалі.

А ў магазінах, на тых паліцах, дзе звычайна пачэсны пасад займала часова забароненая прадукцыя, выстаўляліся толькі, вялі рэй «фугасы» замежнага вырабу — усялякія там «Рыслінгі» ды «Гамза», прывезеныя аж з самой сонечнай Балгарыі. Ахвотнікаў траціць потам зароблены рублі на гэтую «кісляціну», хоць і ў зграбных бутэльках, не знаходзілася. Лепш ужо з якой там пераплатай у каго з прадпрымальных цётак падпольна на «жыватоўку» ўзбіцца. Не ўсе ж з іх баяліся наскокаў ды «раскулачвання» ўчастковага Сямёнавіча, які быццам меў на кожнай вуліцы сваю агентуру ці адмысловы нюх, заўсёды загадзя ўжо ведаў, хто з вяскоўцаў збіраўся расчыняць брагу ці «пускаць цурок». Праўда, быў памяркоўны, нават добразычлівы да землякоў: калі ў каго з «багацеяў» вялося два самагонныя апараты, то забіраў толькі адзін, другі пакідаў.

Прадавачка Вольга, у якой, як мы ведалі, усё ж меўся тады-сяды загашнік у падсобцы, на выпадак візіту мясцовага начальства ці добра знаёмых, на гэты раз была няўмольна катэгарычная: «Хлопчыкі, камісія ўсё віно і гарэлку вымела, ніводнай бутэлькі не паспела прыхаваць. Калі дужа хочаце выпіць, дык гэтага, што ёсць, вазьміце. Гарадскія ж п'юць яго і, мусіць, ні на якую там язву ці гастрыт не жалуюцца. І культурна!..».

З магазіна я і Шурык выйшлі з двума «фугасамі» адзінаццаціградуснага «Рыслінгу» і з такой жа колькасцю пачкаў пячэння.

— Куды пойдзем, каб нікому лішне вачэй не мазоліць? — спытаў я ў Шурыка. Хто-хто, а ён, мясцовы «краязнаўца», павінен ведаць куточкі, дзе можна было б схавацца далей ад людскога вока.

— А туды, за клуб, у наш рэстаран «Неапаль», — жартаўліва махнуў ён рукою ў напрамку клуба і могілак.

Чаму «Неапаль»? Бывае, увечары збяромся там з хлопцамі (не будзеш жа ў самім клубе чарку куляць, каб Іван Сёмкаў не застукаў), сядзім, а з клуба музыка чуецца, а над намі зорачкі зіхацяць, месячык свеціць, а з поля скрып дзеркача даносіцца… Некаму з хлопцаў і прыйшло ў галаву такую назву прыдумаць. Ці не Валодзька Бабок, ён жа ў нас паэт…

Да вечара было яшчэ далёка, і той рамантыкі ў «Неапалі» побач не стаяла. Затое ў канаве нельга было не адчуць нейкай вусцішнасці і ўнутранага захаплення адначасова. Рэзка пахла палыном і іншым разнатраўем.

Загнаўшы ключом ад мінскай кватэры корак у бутэльку, я толькі паспеў набулькаць духмянага, пад колер травы, напою ў стаграмовік і падаць яго Шурыку, як раптам…

— Не п-п-е-рашкодзіў? П-п-прыміце ў сваю к-к-кампанію? — пачулася над нашымі галовамі. Я павярнуўся на голас і ўбачыў над сабою знаёмую постаць вясковага трактарыста Васіля Баранава, няголенага, з нейкай вымучанай усмешкай. Як мне помніцца да ад'езду ў Мінск, я мала калі бачыў яго цвярозым. А што заікаўся часам, дык гэта ў яго было не ад выпіўкі, а ад прыроды. А можа, і ад усяго разам узятага — цяжка сказаць дакладна.

Счакаўшы, калі вып'е Шурык, я зноў набулькаў віна ў чарку і працягнуў яе нечаканаму кампаньёну: жаданы не жаданы, а госць усё ж.

— Н-не, — рашуча адвёў ён маю руку. — Ты адпі палавіну, а ў мяне тут к-к-каняк ёсць, з разьбой. Можна разбавіць яго, к-каб не так шчыпаўся ды к-кусаўся.

Пахіліўшыся набок, ён дастаў з кішэні штаноў круглы, грамаў на дзвесце, флакон… «Трайнога адэкалону». Вінтавая разьба ў флакона з гэтай таннай парфумай сапраўды была адмысловая, надзейная: не на адну-дзве закруткі каўпачка, а можа, на ўсе пяць-шэсць. Васіль зубамі адвінціў чорную галоўку і адэкалон забулькатаў у чарку. Віно ў ёй адразу ж страціла свой празрыста-зеленкавы колер, зрабілася мутна-белай бурдой. Васіль завучана прамовіў: «Водачка, ты адкуль? З Растова. Пашпарт ё? Няма. Тут табе турма» і перакуліў брыдкадухмянае «малако» ў рот. Мы з Шурыкам толькі пераглянуліся і ў думках пашкадавалі, што так неабачліва прапанавалі яму свой посуд. Гледзячы, як мы цягнем кіславаты напой з рыльца бутэлькі, Васіль зноў прычасціўся з арандаванай у нас чаркі разведзеным «каньяком».

Але ж наша застолле ў прыканаўным «Неапалі» неўзабаве займела нечаканы паварот. Раптам мы заўважылі, як ад поля беражком канавы да нас кіруецца даўгалыгая постаць. «Ці не Пеця гэта?» — чамусьці адразу падумалася мне. Калі той падышоў бліжэй, я зразумеў, што не памыліўся: ён. Пецька Свірыдчык. Праўда, і ў вёсцы ён толькі гасцяваў у маці наездамі, а ці не ўсё дарослае жыццё пасля службы ў арміі шастаў па розных там вярбоўках то ў Карэлію, то яшчэ куды далей на Поўнач. І гаворка ў яго была не тутэйшая, а нейкая своеасаблівая, дзіўная, з неадчэпна прычапным «та» амаль да кожнага слова: «Смотрю-та, кто там сидит-та, а это вы душу-та отводите. Не помешал-та?»

Паглядваючы, як бы ямчэй прымасціцца каля нас, ён пацікавіўся:

— А что вы здесь пьёте-та? Сухоньким балуетесь-та? А я тут тоже прихватил-та в магазине кое-что. Правда, не совсем-та приятно пить, но покрепче вашего-та немножко будет. — І запусціў руку ў бакавую кішэню пінжака.

«Няўжо і ў яго каньяк з разьбой?» — падзівіўся я сам сабе, прадбачліва падаючы яму стограмовік з віном.

— Нет, — адмахнуўся Пецька і дастаў з кішэні флакон такога ж, як і ў Васіля, «каньяку». У чарку наліваць не стаў, а культурна павініўшыся: «Вы уж-та извините», адкруціў каўпачок, потым, быццам выконваючы нейкі магічны рытуал, крутануў колькі разоў флакон перад сабой, задраў галаву, і духмянае пітво з флакона, здаецца, само палілося-забулькала ў яго гарляк, быццам даўно чакала такога зручнага моманту, такога свята.

Завязалася нейкая гаворка, але, прыкусіўшы нашым пячэннем, цяпер ужо гутарылі толькі абодва аматары «каньяку з разьбой». Старэйшыя за нас з Шурыкам, яны лепей зналіся між сабою, чым мы, аднак і іх дыялогі пачыналі заходзіць у тупік, бо Васіль, добра захмялеўшы, пачаў яшчэ болей заікацца і з цяжкасцю падбіраць словы, лапаць вакол сябе рукамі, нібы выбіраючы месцейка, каб прылегчы. Калі ж я, пераглянуўшыся з Шурыкам, памкнуўся ўстаць, Васіль раптам ажывіўся:

— Ты к-куды?

— Ды Гулевіч ужо, мусіць, клуб адчыніў, пойдзем туды, — адказаў я за сябе і Шурыка.

— Дык п-п-падажджы ж тады, т-т-там жа д-д-дзеўкі п-п-прыдуць, к-каб ад ц-ц-цябе в-віном н-не н-н-нясло, — і ён неспадзявана для нас абодвух пачаў паліваць мяне і Шурыка з флакона астаткамі свайго «каньяку».

Паддаўшыся такому азарту Васіля, не ўтрымаўся, каб не выплеснуць на нас недапітак «Трайнога» і Пецька. Мяркуючы па ўсім, ужыты «каньяк з разьбой» паспеў узяць сваё: падагрэтая алкаголем душа заўсёды становіцца лагаднейшая і дабрэйшая, чалавек гатовы падзяліцца апошнім…

Выбраўшыся з «Неапаля», я і Шурык яшчэ хвілін з дваццаць патапталіся каля клуба, чакаючы, пакуль прасохнуць крыху штаны і кашулі, толькі тады ўжо наважыліся зайсці.

Дырэктара клуба, светлавалосага і жартаўлівага Вітольда Гулевіча, засталі ў ягоным кабінеце. Утаропіўшыся ў нотны сшытак, ён нарыпваў на баяне нейкую мелодыю, мусіць, рыхтаваў новы музычны нумар для клубнай самадзейнасці. Здароўкаючыся з намі, раптам павёў носам, запытаў весела:

— Вы, можа, у Буду ў цырульню падстрыгацца з'ездзілі? Надушылі ж вас, хоць нос затыкай. За вярсту чуваць, напэўна. І чым жа душылі, «Шыпрам», «Палётам»?

— Каньяком, ды яшчэ з разьбой, — адказаў я і прыгадаў усё, як было. На той рогат, што выбухнуў у дырэктарскім кабінеце, нават бібліятэкарка Зоя адгукнулася:

— Францавіч, хто ж гэта вас так развесяліў?

— Як хто? Каньяк з разьбой!

Не ведаю, з чыёй падачы, з чыйго лёгкага языка, а Васілёў афарызм прыклеіўся да яго ж смяшліва-кеплівай мянушкай: «Хто гэта на трактары паехаў?» — «Каньяк з разьбой». — «Ці праўда, што Каньяк з разьбой да фельчаркі Ксені сватацца сабраўся?»…

І ажаніўся. Згадзілася тая Ксеня, ужо маючы дачушку-школьніцу ад першага шлюбу. На радасць бацькам Васіля: можа, нявестка перайначыць сына, возьмецца за розум? Але ж яшчэ да чарнобыльскай бяды, якая закранула і нашу вёску, пакінуў Васіль гэты свет, мабыць, не здолеўшы перамагчы цягу да ранейшага захаплення.

А я прашу ў цябе, чытач, прабачэння за тое, што мая згадка пра тую даўнюю пачостку ў прыканаўным рэстаране «Неапаль» атрымалася расцягнутай і мудрагеліста-шматслоўнай, як грузінскі тост. Але, спадзяюся, не такою ўжо сумнай і трагічнай, як пры гарбачоўскім «сухастоі», калі гэты славуты «каньяк з разьбой» мог самому «Напалеону» па носе пстрыкнуць: ведай нашых!

«Было пры прадзеду» ці «Было пры прадзедзе»?

Умоўнай практыцы дастаткова выпадкаў, калі ўзнікае неабходнасць выкарыстання асабовых назоўнікаў мужчынскага роду ў месным склоне адзіночнага ліку. Але кадыфікацыя іх канчаткаў на сёння застаецца настолькі неадназначнай, што аўтар, рэдактар і карэктар могуць трапіць у своеасаблівы нерат і застацца там да скону, не здолеўшы знайсці патрэбную лёску з незацягнутым вузельчыкам.

Рэдактар у асноўным выпускнік філфака. Возьмем двух студэнтаў, адзін з якіх вучыцца ў БДПУ імя Максіма Танка, другі — у БДУ. Першы здае іспыты па дапаможніку «Сучасная беларуская мова» (2006) і адказвае: «У асобных назоўніках могуць ужывацца варыянтныя канчаткі: (*пры*) *сын-у* (*-е*), *аграном-у* (*-е*), *Панас-у* (*-е*)», другі — па дапаможніку «Сучасная беларуская мова. Марфалогія» (2018) і адказвае: «Асабовыя назоўнікі з цвёрдай асновай у месным склоне маюць канчатак *-е*: (*пры*) *сыне, браце, салдаце*». Атрымліваецца, што ў выпускнікоў будзе і розны падыход да аналізу і праўкі канчаткаў: у першым выпадку — магчымасць варыянтаў *-у* і *-е* (пераважны заўсёды стаіць на першым месцы), у другім — толькі *-е*.

У падобным становішчы знаходзяцца асабовыя назоўнікі з цвёрдай асновай і канчаткам *-а* (*мужчына, ваявода*). Першы дапаможнік: «Калі ж націск падае на аснову, то ўжываецца канчатак *-у* (*-ю*) (другое скланенне): (*пры*) *бацьку, запявалу, абаронцу* (як (*пры*) *трактарысту*)»; другі: «У месным склоне адзіночнага ліку ў назоўніках мужчынскага і агульнага роду з асновай на цвёрды і ненаціскнымі канчаткамі *-а, -я* рэкамендуецца пісаць канчатак *-е* (*малайчыне Андрэю, непаседзе Алесю*, але *тату*)». А што азначае дзеяслоў «рэкамендуецца»? Толькі парада або перакладванне адказнасці на іншых?

Як жа падыходзяць да гэтай разнастайнасці акадэмічныя даведнікі? Галоўная праца — «Беларуская граматыка» (1985) кадыфікуе канчатак *-е*, але ўдакладняе: «у моўнай практыцы назіралася і назіраецца ў нашы дні ўжыванне дублетных форм на *-у* і *-е*», «Кароткая граматыка беларускай мовы» (2007) пацвярджае асноўны канчатак *-е*, але заўважае: «Назоўнікі *дзед* і *прадзед* могуць мець варыянтны канчатак *-у* (*жыве пры дзедзе, прадзедзе* і *жыве пры дзеду, прадзеду*). Узнікае пытанне: чаму тры назоўнікі (*дзед, прадзед, тата*) так «уганараваны» двума канчаткамі, а *сусед, швед, жывёлавод, стараста* і пад. — не? Усе акадэмічныя (тоўстыя) слоўнікі падаюць толькі канчатак *-е*.

Калі пагартаць некаторыя творы, можна выявіць у Янкі Купалы: «Але аб *беларусу-селяніне*, аб *беларусу-грамадзяніне* ніхто і не падумаў»; у Міколы Ермаловіча: «Унутраная палітычная раўнавага, якая стварылася ў Вялікім Княстве Літоўскім пры *Альгердзе*, адразу парушылася пасля яго смерці»; ва Уладзіміра Арлова: «На гаспадару малатарні *дзеду Арцёму* абрываецца мужчынская лінія бацькавага роду»; у Алеся Пісьмянкова: «...Па-ранейшаму, як і пры *Кулашове*, імкліва бяжыць празрыстая Бесядзь».

Безумоўна, парадыгма скланення спрасцілася б, каб для асабовых назоўнікаў мужчынскага роду былі абраны толькі два канчаткі — *-у* і *-ю*: (*пры*) *Івану, аграному, Рыгору, ткачу, Алегу, калмыку, казаху, Алесю, вучню*. Аднак вышэйпрыведзены сказ з Янкі Купалы паказвае, што шмат залежыць ад аўтарскага выбару, ад пазіцыі рэдактара, а таксама ад мілагучнасці фразы. Як лепш: *пры Адаме Міцкевічу* ці *пры Адаму Міцкевічу*, *па сваім дзедзе* ці *па сваім дзеду*, *аб старасце Лаўрэлю* ці *аб старасту Лаўрэлю*? Сёння адказ даць складана — усё адно хтосьці будзе незадаволены. «Працэс дыферэнцыяцыі яшчэ не завяршыўся», — піша наконт разгляданых формаў даследчыца Альбіна Хромчанка ў артыкуле з красамоўнай назвай «Сам сабе “граматыка”», таму рэдактару лепш за ўсё пакідаць аўтарскі варыянт назоўніка без змен.

Пятро ЖАЎНЯРОВІЧ

...І стала менш у класіка загадак

Фундаментальная навукова-папулярная праца «Таямніцы Дуніна-Марцінкевіча», якую летась выдаў Беларускі дакументацыйны цэнтр — вынік даследчыцкай дзейнасці, чатырохгадовай працы ў архівах Беларусі і Расіі гісторыка-архівіста Зміцера Дразда. Кніга прысвечана высвятленню найменш даследаваных, а то і зусім невядомых старонак жыцця першага класіка беларускай літаратуры і нашага першага прафесійнага літаратара. Дык што ж прынцыпова новага сказаў аўтар? У цэлым — шмат. А цяпер пра самае істотнае.

Сам аўтар найбольш важным сваім адкрыццём лічыць тое, што яму ўрэшце ўдалося раскрыць таямніцу прозвішча нашага класіка. У выніку працяглых архіўных пошукаў даследчык выявіў некалькі дзясяткаў разнастайных дакументаў: выпіскі з метрычных кніг, судовыя позвы, даверанасці, пратаколы, прашэнні, фармулярныя спісы, лісты і інш., якія адназначна засведчылі, што прыдомка «Дунін» да прозвішча Марцінкевіч не мелі не толькі яго продкі, але і сам Вінцэнт Іванавіч амаль да 25-гадовага ўзросту. Гэты прыдомак з’явіўся толькі ў 1832 г., калі будучы класік пачаў рабіць першыя спробы афіцыйна даказаць сваё дваранскае паходжанне. Дарэчы, канчаткова старажытнае шляхецкае паходжанне Дуніна-Марцінкевіча было зацверджана толькі ў 1838 г., прычым, паводле пададзеных ім дакументаў, ягоны род нібыта быў вельмі старажытным і выводзіўся ад нейкага Пятра Дуніна — магчыма, датчаніна па нацыянальнасці, які жыў ажно ў XII стагоддзі. Зміцер Дрозд у кнізе выказвае сур’ёзныя сумненні наконт гэтай версіі і сцвярджае, што хутчэй за ўсё не існавала ніякай роднасці паміж вышэйназваным сярэдневяковым персанажам і нашым класікам. Чаму? А таму, што прамежак часу паміж жыццём магчымага першапродка і дакладна зафіксаванымі архіўнымі звесткамі пра самых даўніх продкаў нашага класіка, складае звыш 500 (!) гадоў, што з вялікай доляй верагоднасці выключае магчымасць існавання ўсялякага сваяцтва паміж Пятром Дуніным і Вінцэнтам Дуніным-Марцінкевічам.

Акрамя таго, гісторык-архівіст аргументавана абверг стэрэатып пра тое, што Дунін-Марцінкевіч ужо ў дзяцінстве стаў круглым сіратой. Ён даказаў, што калі бацька Вінцэнта сапраўды памёр праз некалькі месяцаў пасля нараджэння сына, то маці памерла толькі ў 1830 г., калі яму было ўжо 22 гады і ён знаходзіўся на казённай службе ў Мінску. А яшчэ даследчык давёў, што бліжэйшыя продкі Дуніна-Марцінкевіча і ён сам былі зусім не беднымі людзьмі. Да таго ж будучы беларускі класік у маладым узросце кінуў казённую службу і набыў маёнтак Люцынка (Мінскі павет), дзе валодаў немалымі зямельнымі ўчасткамі і меў прыгонных сялян.

У адрозненне ад ранейшых айчынных даследчыкаў Зміцер Дрозд сцвярджае, што, кіраўнік усіх каталікоў Расійскай імперыі, архіепіскап Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч, з’яўляецца сваяком не Дуніна-Марцінкевіча, а ўсяго толькі першай жонкі ягонага бацькі. А яшчэ адным цікавым фактам з’яўляецца тое, што аўтар высветліў наяўнасць далёкага сваяцтва беларускага пісьменніка з паэтам Аляксандрам Пушкіным: расійскі класік з’яўляўся праўнучатым пляменнікам другой жонкі дзеда нявесткі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.

Адметнай рысай даследавання з’яўляецца яшчэ і тое, што яе аўтар не абыходзіць і некаторыя непрывабныя, «цёмныя» старонкі біяграфіі пісьменніка. На першы погляд, гэтыя факты нібы ў нейкай ступені дыскрэдытуюць айчыннага класіка, аднак, з другога боку, яны ў сукупнасці з мноствам яго годных учынкаў і творчых здзяйсненняў ствараюць аб’ёмна-цэласны і разам з тым цалкам жывы вобраз.

Непрывабныя старонкі біяграфіі першага прафесійнага літаратара Беларусі звязаны найперш з шэрагам абаінавачванняў яго ў розных злачынствах, з-за якіх яму давялося і вытрымаць шматлікія допыты, і пасядзець у турме, і пабываць пад хатнім арыштам. Так, Зміцер Дрозд сцвярджае, што Дунін-Марцінкевіч двойчы сядзеў у Мінскай турме (былы Пішчалаўскі замак). Першы раз гэта мела месца ў 1835 г. у сувязі з гучнай тагачаснай справай аб падробцы разнастайных дакументаў — пераважна звязаных з пацвярджэннем дваранскага паходжання заказчыкаў. І хоць непасрэдны ўдзел у гэтай афёры не быў даказаны, тым не менш Вінцэнт Іванавіч правёў каля тыдня ў турме, а затым пэўны час знаходзіўся пад хатнім арыштам. А другі раз турэмнае зняволенне мела месца ў 1864 г. з-за абавінавачванняў у яго магчымай падтрымцы ўдзельнікаў паўстання пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Хаця вядома, што Дунін-Марцінкевіч адкрыта не дапамагаў паўстанцам, а толькі сімпатызаваў ім і ў крайнім выпадку мог кагосьці з іх прытуліць у сваім маёнтку Люцынка. Тым не менш ён прайшоў праз допыты і каля года прасядзеў у Мінскай турме, пасля чаго яго адправілі ў Люцынку і строга забаранілі адтуль выязджаць. У той жа час ягоная дачка Каміла за актыўныя антыўрадавыя выступы была саслана царскімі ўладамі на 10 гадоў у Сібір.

У гэтым кантэксце нельга не згадаць яшчэ адзін факт з жыцця маладога Вінцэнта, які быў звязаны з яго абвінавачваннямі ў такім злачынстве, як «кіднэпінг» — выкраданне дзяцей. Маці яго будучай жонкі звярнулася ў паліцыю з заявай аб тым, што Вінцэнт нібыта прама на вуліцы выкраў яе непаўналетнюю дачку Юзэфу і неўзабаве таемна з ёй абвянчаўся. Аднак Зм. Дрозд высветліў, што ў працэсе працяглага разбіральніцтва і допытаў было вызначана, што насамрэч Юзэфа ўжо мела 16 гадоў (а не 14, як казалі яе бацькі) і добраахвотна, без усялякага прымусу і выкрадання пагадзілася на шлюб. У выніку з Вінцэнта знялі ўсе абвінавачванні і дазволілі яму афіцыйна абвянчацца з Юзэфай у мясцовай грэка-каталіцкай царкве.

Па-сапраўднаму ўражвае надзвычай вялікі аб’ём у кнізе разнастайных дакументаў і матэрыялаў. Агулам яны займаюць каля 160 старонак, а тэкстуальная частка кнігі перавышае памер дакументальнай крыху болей чым у два разы. У кнігу ўключаны архіўныя дакументы на рускай, польскай і лацінскай мовах, сярод якіх пераважаюць шматлікія архіўныя справы — пераважна метрыкі аб нараджэнні і хрышчэнні, даверанасці, прашэнні, судовыя позвы, кантракты на арэнду, квітанцыі, распіскі, рапарты, пастановы, заявы, тастаменты, справаздачы, рэзалюцыі, аб’явы, пратаколы пасяджэнняў, асабістыя лісты… Прычым адметна тое, што ўсе польскамоўныя дакументы друкуюцца ў арыгінале, а нешматлікія матэрыялы на лацінскай мове пададзены ў беларускіх перакладах, зробленых вядомым айчынным лаціністам, кандыдатам філалагічных навук Алесем Жлуткам.

Безумоўна, аўтарам праведзена каласальная праца, што сведчыць аб яго даследчыцкай апантанасці. Тым не менш… кніга не пазбаўлена і пэўных недахопаў. Не надта ўдалай выглядае агульная структура кнігі, якая падзелена ажно на два дзясяткі раздзелаў, прысвечаных самым розным (часам малазначным) аспектам жыцця Дуніна-Марцінкевіча і яго сваякоў. Да таго ж гэтыя структурныя адзінкі па сваім аб’ёме «вагаюцца» ў занадта вялікіх памерах — ад 5 да 50 старонак. Непадрыхтаваны чытач можа папросту заблытацца і згубіцца ў неабсяжным «акіяне» шматлікіх звестак, лічбаў і датаў.

Па-другое, калі гэтая кніга вызначана як «навукова-папулярнае выданне», то ў ім, на маю думку, абавязкова павінна быць агульнае заключэнне, у якім былі б ёміста прадстаўлены галоўныя вынікі даследавання, зроблены адпаведныя высновы і акрэслены асноўныя задачы для будучых даследчыкаў-марцінкевічазнаўцаў. Бо без гэтага досыць складана адэкватна засвоіць і трывала запомніць той вялізны масіў інфармацыі, які ледзь не з першых старонак літаральна паглынае чытача.

Хочацца таксама дадаць, што ў некаторых раздзелах кнігі Зміцер Дрозд выявіў сябе не толькі як карпатлівы і здольны гісторык-архівіст, але і як чалавек з пэўным літаратурным густам. Таму лічу, што ў будучым ён — пры ўмове няспыннай працы над сабой і над словам — мог бы напісаць нават раман-біяграфію Дуніна-Марцінкевіча ці прынамсі сцэнарый дакументальнага/мастацкага фільма пра пакручасты жыццёвы шлях гэтага выбітнага пісьменніка.

У цэлым жа аўтар выдаў надзвычай важную і цікавую кнігу, якая робіць заўважны ўнёсак у гісторыю беларускай літаратуры і разам з тым з’яўляецца каштоўнай часткай багатай скарбонкі айчыннага марцінкевічазнаўства. Істотна найперш тое, што па старонках выдання раскрыты даўнія таямніцы Дуніна-Марцінкевіча, якія многія дзесяцігоддзі аніяк не паддаваліся правільнаму вытлумачэнню.

А найбольш важна тое, што перыпетыі жыцця выдатнага пісьменніка і ягоных шматлікіх продкаў і нашчадкаў аўтар прасочвае на шырокім фоне розных вызначальных падзей у гісторыі Беларусі (найперш войны, паўстанні, рэвалюцыі). Гэта стварае аб’ёмную і цэласную карціну чалавека ў кантэксце эпохі і дазваляе аднесці кнігу да жанру гісторыка-біяграфічных выданняў.

Эдуард ДУБЯНЕЦКІ

на паліцы

«Тимецъ» — як па-беларуску?

Яшчэ ў 1920-я гады лінгвісты разумелі неабходнасць стварэння поўнага лексікаграфічнага даведніка, які б ахопліваў слоўнікавы склад усіх вядомых рукапісных і друкаваных помнікаў часоў Сярэднявечча, створаных на гістарычна беларускіх землях. Але складаная палітычная сітуацыя, ваенныя падзеі не дазволілі гэтым планам ажыццявіцца адразу.

Праца паводле запланаванай праграмы па падрыхтоўцы гістарычнага слоўніка пачалася толькі ў 1960 годзе, і звязана яна з імем славутага беларускага вучонага, дыяхраніста, члена-карэспандэнта АН БССР Аркадзя Жураўскага.

Так, амаль два гады таму ў Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі завяршыўся фундаментальны праект, які без сумнення можна назваць эпахальным: убачыў свет апошні, 37-ы выпуск «Гістарычнага слоўніка беларускай мовы», слоўніка, які з 1982 г. папаўняў паліцы вядомых сусветных бібліятэк, лінгвістычных інстытутаў, прыватныя кнігазборы. У слоўніку ў поўным аб'ёме адлюстравана лексічная сістэма старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовы (XIV—XVIII стст.).

Крыніцамі слоўнікавага матэрыялу паслужылі рукапісы і кнігадрукі перакладнога і арыгінальнага характару, напісаныя на старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове. Да іх належаць помнікі юрыдычнага характару (кнігі Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага; Вісліцкі статут XV ст.; Статуты Вялікага Княства Літоўскага 1529, 1566 і 1588 гг.), свецка-мастацкія творы (летапісы, напрыклад: Віленскі летапіс XV ст., Баркулабаўскі летапіс XVII ст.; хронікі, напрыклад: беларускі пераклад вядомай хронікі Мацея Стрыйкоўскага (пачатак XVII ст.); рыцарскія раманы і аповесці, напрыклад: «Аповесць аб Трыстане» (каля 1580 г.), «Гісторыя аб Атыле» (каля 1580 г.)), помнікі рэлігійнага зместу (пераклады асобных кніг Свяшчэннага Пісання, напрыклад: Біблія ў перакладзе Францыска Скарыны, пераклад Евангелля Васіля Цяпінскага каля 1580 г.; «Чэцця» (1489), перапісаная пісарам Бярозкам з-пад Навагрудка; катэхізісы, напрыклад: «Катэхізіс» Сымона Буднага (1562); агіяграфічныя творы, напрыклад: «Жыціе Аляксея, чалавека божага» (канец XV ст.) і інш. У слоўнік быў уключаны і лексічны матэрыял з самых ранніх лексіконаў старабеларускай мовы пад аўтарствам Лаўрэнція Зізанія (1596) і Памвы Бярынды (1653).

У 37 выпусках «Гістарычнага слоўніка беларускай мовы» лекскікаграфічную апрацоўку атрымалі звыш 75 тысяч слоў. У першым выпуску маецца грунтоўная прадмова ініцыятара падрыхтоўкі слоўніка і галоўнага рэдактара першых чатырнаццаці выпускаў А. І. Жураўскага, у якой дадзена агульная характарыстыка слоўніка, абгрунтаваны яго храналагічныя межы і

выбар крыніц. Як вядома, на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага было створана шмат пісьмовых помнікаў на розных мовах, таму асаблівая ўвага скіроўвалася на адмежаванне помнікаў, напісаных на старабеларускай мове, ад помнікаў, у якіх пераважала царкоўнаславянская або польская моўная стыхія.

Пасля стварэння картатэкі, над якой на працягу звыш дзесяці гадоў працаваў сектар гісторыі беларускай мовы Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа, А. І. Жураўскім была выпрацавана канцэпцыя будучага лексікаграфічнага даведніка: вызначаны крытэрыі размежавання фанетычных, марфалагічных, словаўтваральных варыянтаў загаловачных лексем, спосабы тлумачэння слоў, прынцыпы падачы ілюстрацыйнага матэрыялу.

Слоўнікавы артыкул у «Гістарычным слоўніку беларускай мовы» складаецца з загаловачнага слова, указання на яго граматычную характарыстыку, тлумачэння яго значэння / значэнняў: для гэтага мог падбірацца адпаведны лексічны эквівалент сучаснай беларускай мовы да старажытнага слова, мог падавацца сінанімічны рад або разгорнутае тлумачэнне, калі гаворка ішла пра прадметы, рэаліі ці паняцці, якія выйшлі з ужытку, напрыклад:

Тимецъ, цимецъ *наз. Дублёная скура* (ГСБМ, вып. 33, с. 304);

Типография *наз. Друкарня* (ГСБМ, вып. 33, с. 305).

Кожны слоўнікавы артыкул суправаджаецца тэкставымі ілюстрацыямі. Укладальнікі слоўніка імкнуліся паказаць увесь магчымы спектр ужывальнасці той ці іншай лексемы ў помніках старабеларускай пісьменнасці. Напрыклад, калі параўнаць тры слоўнікавыя артыкулы з 32-га выпуску, то становіцца відавочна, што ўжывальнасць лексемы ***смысление*** з царкоўнаславянскім словаўтваральным фармантам абмежавана помнікамі рэлігійнага і свецкага зместу, аднакарэннае прыслоўе ***смыслено*** ўжывалася толькі ў рэлігійных тэкстах ранняга перыяду развіцця старабеларускай мовы, а лексема ***смысленость*** адзначана толькі ў тэксце дзелавога характару:

Смысление, смышление *наз. Дзеянне па дзеясл.* смыслити *ў 1 знач.* онъ наполневалъ домы их добра, тако во смысление далеко буди w*т* мене (Скар. I К, 28б); смышленіе*ж* w щедрости традно е*ст* а w скоупости легко е*ст* (Арыст., 140); рwдъ ибо суще божіи, не должни есмо непщевати, злату и срѣбрю или каменію начертанію хитрости и смышленію чёка, Бога быти подобна (Будны, 12); Смыслъ: Смышленіе, ростропность (Бяр., 152).

Смыслено, смышлене *прысл. Разумна, разважліва.* послишаите брат вѣрнии хрсть не смыслено и разuмно (Чэцця, 288); им[s] же далъ е*ст* гсдь мудрость и наuку абы uмели смыш[s]лене делати еже к потребамъ святыни надобна суть (Скар. КІ , 67б—68). *Параўн.* смыслне.

Смысленость *наз. Тое, што і* смысльность. для того смысленостью рады уставено естъ, абы безрадствомъ и невъставичъностью речей, которыи жъ ся имуть напотомъ деяти, шкоды бы не было (КЗ, 783, 1499).

Такі падыход вельмі важны для будучых лінгвістычных даследаванняў, паколькі ў слоўніку ўжо маецца інфармацыя аб ступені ўжывання той ці іншай лексемы, аб прысутнасці яе ў помніках рознага жанравага напаўнення, аб часе функцыянавання гэтай лексемы ў мове старабеларускай пісьменнасці. Над слоўнікам на працягу ўсяго перыяду яго стварэння працавалі высокакваліфікаваныя распрацоўшчыкі, якія складалі эфектыўную творчую групу, добра ведалі сваю справу і былі зацікаўлены ў яе выніках.

«Гістарычны слоўнік беларускай мовы» — неабходная лексікаграфічная крыніца для вырашэння актуальных пытанняў гістарычнай лексікалогіі, этымалогіі, для правядзення параўнальна-супастаўляльных даследаванняў славянскіх і неславянскіх моў. Ён утрымлівае неабходныя намінацыйныя сродкі для пісьменнікаў, чые творчыя інтарэсы звязаны з узнаўленнем гістарычнага каларыту мінулых стагоддзяў. Слоўнік запатрабаваны пры выкладанні дысцыплін гісторыка-лінгвістычнай накіраванасці ў вышэйшых і сярэдніх навучальных установах Беларусі; пры падрыхтоўцы да выдання старажытных помнікаў розных жанраў, пры іх апрацоўцы, каментаванні і перакладзе на сучасныя мовы, а таксама ў дзейнасці па захаванні нацыянальнай кніжнай спадчыны.

Іван САВЕРЧАНКА

Пад кронамі старых дрэў



Каб адчуць атмасферу старадаўняй гісторыі, поўнай таямніц і рамантычных паданняў, з яе славутымі шляцецкімі палацамі, пышнымі баламі, вытанчанымі прыгажунямі, якія маглі разбіць сэрца з першага позірку, і фатальнымі каханнямі з абавязковай трагічнай развязкай, не трэба вандраваць «па Парыжах» — дух слаўнай мінуўшчыны хаваюць і многія мясціны нашай зямлі, а між сцен айчынных гарадоў стаіліся старадаўнія падмуркі. Нават прывіды іх былых гаспадынь, стаміўшыся лічыць імгненні вечнасці, выходзяць зрэдку на белы свет — ёсць сведкі, якія сцвярджаюць, што бачылі іх…

Калісьці віравала шляхецкае жыццё і ў Лошыцкім маёнтку, які цяпер знаходзіцца ў сталічных межах і з'яўляецца помнікам сядзібна-паркавага мастацтва Беларусі XVIII—XIX стагоддзяў. Яго гісторыя з часоў першых згадак у старадаўніх дакументах, у ваенны перыяд і да сёння падрабязна апісана на старонках кнігі Юрыя Кур'яновіча «Старасвецкая Лошыца», што летась пабачыла свет у выдавецтве «Беларусь». Аўтар сабраў легенды пра мясціны, дзе цяпер красуе парк, паданні пра рэчку, якая апярэзвае яго з поўдня і жывіць сваімі водамі тутэйшыя поплавы, злучыўшыся са Свіслаччу, прывёў версію яе назвы — Лошыца. Ю. Кур'яновіч прыводзіць адметныя ў гісторыі маёнтка факты: у розныя часы там гасцявалі выбітныя свецкія асобы, сярод якіх — Станіслаў Панятоўскі (тагачасны гаспадар, Станіслаў Ксаверый Прушынскі і яго пляменнік належалі да блізкага атачэння апошняга польскага караля і вялікага князя літоўскага). Ёсць версія, што і Павел І, талерантна настроены да палякаў расійскі імператар, бываў у Лошыцы.

Адметна, што аўтар прыводзіць і гісторыю храмаў, якія былі на тэрыторыі Лошыцы, сярод іх — унікальная ў сваім родзе Лошыцкая алтарыя. І хоць яна не захавалася, выява пачатку XX стагоддзя, змешчаная ў выданні, дае магчымасць уявіць яе выгляд. Дзякуючы планам і картам, а таксама прыведзеным у кнізе даўнім здымкам будынкаў, узведзеных на тэрыторыі сядзібы, можна мець уяўленне і пра кампазіцыйную будову комплексу. Істотна дапаўняе агульную карціну рэпрадукцыя акварэлі Юзафа Пешкі пачатку XIX стагоддзя, — гэта адна з самых ранніх выяў сядзібы. Цікава даведацца, што адзін з уладальнікаў Лошыцы, Прот Прушынскі, — падпалкоўнік артылерыі коннай гвардыі Каралеўства Польскага, 31 ліпеня 1833 года быў залічаны Мінскай губернскай камісіяй да 2-га разраду дзяржаўных злачынцаў за ўдзел у паўстанні. Адметна і тое, што вобразы лошыцкіх сялян трапілі на старонкі вершаванай аповесці Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча «Вечарніцы», з якімі пісьменнік неаднаразова гутарыў падчас візітаў да Яўстафія Прушынскага.

Не менш цікавая гісторыя сядзібы і ў XX стагоддзі. З сярэдзіны 1920-х да сярэдзіны 1980-х гадоў на тэрыторыі Лошыцы працавалі беларускія навукоўцы-селекцыянеры, дзякуючы якім у нашай краіне адрадзілася такая навука, як селекцыя. Пад наглядам Эмы і Аляксея Сюбаравых, вучоных у галіне селекцыі пладовых культур, а таксама Аляксея Валузнёва, вучонага-пладавода, тут вырошчваліся сады і ягадныя гадавальнікі. Сёння ледзь не на кожным дачным участку, на кожным вясковым агародзе растуць сартавыя яблыні і грушы, красуюцца дрэўцы чарэшань і кусты парэчак, — за гэта трэба сказаць «дзякуй» менавіта гэтым вучоным, якія захавалі ў цяжкі ваенны час насенне раслін і вывелі іх новыя каштоўныя гатункі. З Лошыцай звязана і гісторыя мінскага падполля — аўтар згадвае яе гераічныя і трагічныя старонкі, ілюструючы іх фотаздымкамі.

Выданне Юрыя Кур'яновіча не толькі пра помнікі архітэктуры. Яно распавядае пра тое, што мы мусім ведаць і чым можам ганарыцца. Магчыма, кагосьці яно натхніць, каб павандраваць пад кронамі старых дрэваў, якія захоўваюць дух гістарычнай спадчыны, наведаць музей «Лошыцкая сядзіба» і адкрыць для сябе гэты ўнікальны маляўнічы і ў чымсьці яшчэ таямнічы куточак Бацькаўшчыны.

Яна БУДОВІЧ

мастацкія практыкі

Алена РУСАКЕВІЧ

Каталізатар перамен

Адзін з найважнейшых этапаў у гісторыі мастацтва Беларусі, які паўплываў на ўзнікненне і развіццё найноўшых формаў у айчынным мастацтве, — перыяд перабудовы. Гэта час трансфармацый і ўстанаўлення новых правіл не толькі ў эканоміцы, палітыцы і сацыяльным жыцці, але і ў культуры. Другая палова 1980-х — пачатак 1990-х гадоў у БССР — перыяд развіцця акцыянізму, канцэптуалізму, постмадэрнізму. Характэрнаю асаблівасцю гэтага перыяду стала фарміраванне вялікай колькасці рознага кшталту мастацкіх груп і аб'яднанняў. Мастацтва гэтага перыяду непарыўна звязана з іх дзейнасцю, паколькі менавіта гэта стала каталізатарам працэсу творчых пераўтварэнняў.

У канцы XX стагоддзя ў БССР былі сфарміраваны такія мастацкія аб'яднанні, як «Форма», «Галіна», «Плюраліс», «Квадрат», «Комі Кон», «Беларускі клімат», «Няміга-17», «Пагоня», «Верасень», «Бісмарк», «Беларуская акадэмія выяўленчага мастацтва» і іншыя. Іх прырода была новая, і, у адрозненне ад розных мастацкіх аб'яднанняў папярэдніх перыядаў, аб'яднанні часоў перабудовы мелі свае характэрныя асаблівасці. Напрыклад, тут практычна не было маніфестаў або выразна сфармуляваных мэтаў і задач. Акрамя таго, многія з іх не былі афіцыйна зарэгістраваныя. Афіцыйнымі былі толькі такія мастацкія аб'яднанні і групы, як «Няміга-17», «Пагоня», «Верасень», «Беларуская акадэмія выяўленчага мастацтва».

Дзейнасць мастацкіх груп і аб'яднанняў у БССР у перыяд перабудовы з'яўляецца фактарам, які паўплываў на актыўнае развіццё постмадэрнісцкіх тэндэнцый у мастацтве. Бо з 1980-х гадоў прадстаўнікі мастацкіх груп і аб'яднанняў у сваёй творчасці пачалі пераасэнсоўваць напрацоўкі айчынных папярэднікаў, а таксама еўрапейскіх і амерыканскіх мастакоў-мадэрністаў, відазмяняючы і адаптуючы ў сваіх творах некаторыя фармальна-стылістычныя мадэрнісцкія прыёмы. Мастакі гэтага перыяду адкрываюць для беларускага мастацтва такую новую форму, як акцыянізм. Варта адзначыць, што аўтарамі большасці мастацкіх акцый былі якраз удзельнікі аб'яднанняў і груп. У выніку перфарматыўныя практыкі сталі адной з візітовак мастацтва БССР 1980—1990 гадоў. У гэты час набірае папулярнасць такі від мастацтва, як інсталяцыя. Гэтыя аб'яднанні зрабілі таксама вялікі ўнёсак у развіццё канцэптуалізму ў Беларусі. Акрамя таго, дзейнасць мастацкіх аб'яднанняў і груп перыяду перабудовы непарыўна звязана з актыўнай выставачнай дзейнасцю. Велізарная колькасць выставак іх твораў была праведзена ў Мінску, а таксама ў іншых гарадах Беларусі. Гэтыя мерапрыемствы часта насілі публічны характар, што ўскосна спрыяла паступовай папулярызацыі сучаснага мастацтва ў краіне.

Усё вышэйсказанае яшчэ раз пацвярджае той факт, што дзейнасць мастацкіх груп і аб'яднанняў канца 1980 — пачатку 1990-х гадоў у БССР стала неад'емнай часткай культурнай спадчыны краіны і непасрэдна паўплывала на фарміраванне многіх тэндэнцый у сучасным мастацтве Беларусі.

Адысці ад сувеніраў?

Кераміка ў Беларусі: у спадзеве на функцыянальнасць і дэкаратыўнасць

На якім узроўні сёння нацыянальная кераміка? Ці адчувае ўплывы мастацкага рынку? Каго сёння можна назваць сапраўдным керамістам?.. Некалькі гадоў таму ў Беларусі была створана Гільдыя керамістаў, каб больш мэтанакіравана працаваць на падтрымку нацыянальных традыцый у кераміцы. А ў Бабруйску ўжо 15 гадоў праходзіць пленэр «Арт-Жыжаль», у якім прымаюць удзел як айчынныя, так і замежныя керамісты, у прыватнасці з Азербайджана, Венесуэлы, Балгарыі, Вялікабрытаніі, Індыі, Японіі, ЗША, Францыі і Турцыі. Пасля пленэру работы дэманструюцца на выстаўцы «Арт-Жыжаль». Сёлета яна прайшла ў сталічным Палацы мастацтваў.

Работа Тамары Васюк.

Спалучэнне жывога агню і гліны, удасканальванне мастацтва керамікі і новых тэхнік — аўтары прадэманстравалі больш за 300 работ і кампазіцый. Заснавальнік пленэраў, якія штогод праходзяць пад Бабруйскам, — мастак-кераміст Валерый Калтыгін. Больш чым дваццаць гадоў ён займаецца керамікай, працуе над тэарытычнымі матэрыяламі ў гэтым кірунку, разумее стан спраў.

— На жаль, у кераміцы больш сталых майстроў, а моладзі вельмі мала, — расказвае Валерый Калтыгін. — Дарослае пакаленне працуе ў звыклых для сябе формах, а калі мастаку навязваюць змены звонку, то ў яго гэта выклікае ўнутраны дысананс. Нікому не хочацца канфлікту з самім сабой. У нашай краіне не самая лепшая матэрыяльная база для развіцця керамікі. Калі ў нас ёсць добрая кераміка, то гэта ў асноўным дэкаратыўныя рэчы. Я заложнік уласнай страсці. Займаюся керамікай з 1992 года. Часам думаю кінуць, але не магу. Хоць і разумею, што мы падышлі да нейкага тупіка. У развіццё трэба ўкладваць фінансы, якіх бракуе. Сапраўдная добрая кераміка не можа быць масавай ці толькі відовішчнай. Гэта ж сур'ёзная, працаёмкая работа, якую зрабіць танна немагчыма.

Тым не менш нашы керамісты зацікаўлены ў тым, каб развіваць нацыянальную кераміку, аб'ядноўвацца і шукаць актуальныя напрамкі. Замежным майстрам цікава абменьвацца досведам з нашымі майстрамі, сачыць за тым, як у дастаткова незвычайных умовах (на прыродзе) адбываецца творчы працэс на тым жа пленэры. Валерый Калтыгін лічыць, што яны прыязджаюць, каб атрымаць задавальненне ад працэсу, пры тым, што пад канец пленэру ўсе адчуваюць стомленасць.

— Спачатку пленэр быў штогадовы, цяпер праводзіцца раз у два гады. У мастакоў знікае ад гэтага ўнутраная вастрыня, — тлумачыць кераміст. — Я хачу, каб людзі разумелі, што мы робім сапраўдны пленэр. Гэта не сімпозіум, не проста сустрэча. Пленэр — гэта сапраўднае яднанне з прыродай. Такіх цяпер мала. Звычайна мастакі выязджаюць на вытворчыя базы, іх усім забяспечваюць, і ідзе спакойны працэс творчасці. У нас па-іншаму: закладзены каштарыс, ад якога немагчыма адарвацца. Работы атрымліваюцца своеасаблівыя, праўда, узровень не вельмі высокі. А хочацца, каб трымалася высокая планка. Для гэтага вытворчая база павінна быць іншая. Ёсць пытанні па якасці матэрыялу. Але радуе, што майстры з розных краін могуць сустрэцца, падзяліцца досведам, ацаніць адзін аднаго.

Тое, што дае пленэр, — не адзіная ўмова для развіцця керамікі ў Беларусі. Сёння ў Акадэміі мастацтваў і ва ўніверсітэце культуры і мастацтваў рыхтуюць керамістаў. Кожны год студэнты абараняюць дыпломы. І, дарэчы, гэтыя работы таксама пасля трапляюць на выстаўкі. За многімі беларускімі гарадамі замацаваліся назвы «горад керамістаў». Так, напрыклад, нядаўна ў Мінску прайшла выстаўка «Керамісты Жодзіна».

— На мой погляд, яркіх работ цяпер мала. Тая моладзь, якая вучыцца ў нашых творчых ВНУ, чамусьці працуе з матэрыялам неахвотна, — тлумачыць Валерый Калтыгін. — Работы паўтараюцца. Гаршкі і званочкі. А павінна быць нейкая глыбокая ідэя. Я бываў у Вільні і бачыў, якая там вытворчая база. Абсалютна іншы ўзровень. Нашай кераміцы не хапае функцыянальнасці і дэкаратыўнасці.

У нашай краіне даўно вядуцца размовы пра стварэнне музея керамікі, але пакуль пытанне не вырашана. Валерый Калтыгін на працягу пяці гадоў звяртаўся да ўлад Бабруйска, каб у горадзе з'явіўся музей альбо нават цэнтр керамікі. За гады пленэраў у майстра засталося шмат работ, якія могуць стаць вялікай калекцыяй для творчай установы.

Але гэта не адзінае пытанне, якое хвалюе прафесіяналаў, зацікаўленых у развіцці кірунку:

— Калі б Міністэрства культуры па заканадаўчай лініі заахвочвала прыватны бізнес, каб ён укладваў грошы ў розныя жанры мастацтва, у тым ліку ў кераміку, сітуацыя б выправілася. Хто сёння набудзе добрую работу за вялікія грошы? Ніхто. У нас купляюць сувеніры. Рынку дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва не існуе як такога. А мастак, акрамя грошай, укладае ў працу пачуцці, эмоцыі, вырашае творчыя задачы, таму добрую работу ён не хоча прадаваць танна. Я ведаю многіх прафесійных мастакоў, якія ўмеюць ствараць неверагодныя рэчы, але робяць кітч, таму што гэта цікава цяперашняму спажыўцу.

Гэта пытанні, якія хвалююць арганізатараў выстаўкі «Арт-Жыжаль». Аднак Валерый Калтыгін ужо пачаў рыхтавацца да 16-га пленэру.

Вікторыя АСКЕРА, фота аўтара

Імгненні...

у кінафатаграфічных творах Аліка Замосціна

«Асалода ад жыцця» — новы фотапраект беларускага і ізраільскага фотамастака Аліка Замосціна, які прадставілі ў Нацыянальным гістарычным музеі. Выстаўка ўключаная ў афіцыйны каляндар культурных падзей II Еўрапейскіх гульняў. У яе экспазіцыі прадстаўлены 35 мастацкіх фатаграфічных работ.

За тры гады беларускі глядач пазнаваў гэтага аўтара праз праекты «Пункт гледжання», «Базар агародніны» і «Партрэты», у якіх галоўным канцэптуальным пасылам была ідэя. Гэтым разам ідэі няма, аўтар дэманструе асабістае стаўленне да свету. Работы Аліка Замосціна — дакладна прыкмечаныя і «вырваныя», дзе ўсё жыццё чалавека спрэсаванае ў адным імгненні.

— Гэта ў асноўным здымкі аднаго імгнення. Я не раблю 10—20 кадраў аднаго прадмета або чалавека і не выбіраю з вялікай колькасці лепшы, — тлумачыць Алік Замосцін. — Раблю адзін ці два кадры. Лічу: альбо ты злавіў момант, альбо не.

Аўтар захапляецца жыццём, адчувае асалоду ад сустрэч, расстанняў, світанняў і заходаў. У яго ёсць свой погляд на людзей і іх учынкі, на гарады і прыроду, на сувязь ўсяго існага. Героі Замосціна — прыгожыя, маладыя і не вельмі мужчыны і жанчыны. Яны не пазіруюць, а проста жывуць.

Фатаграфія майстра нагадвае кадры з кінафільмаў. Праглядаецца драматургія, нават рэжысёрская пастаноўка кадра. Творы Замосціна адметныя мінімалізмам дэталяў. Большасць здымкаў чорна-белыя.

— Калісьці фатаграфія была для мяне хобі, — тлумачыць аўтар. — Першы фотаздымак зрабіў, калі пачаў займацца альпінізмам, гэта было ў 60—70-х гадах, у маім савецкім мінулым, яшчэ да таго, як я эміграваў з Беларусі. Здымаў для хатняга архіва, але, на жаль, практычна ўсе фатаграфіі таго перыяду не захаваліся з-за частых пераездаў. Гэта цяпер у мяне некалькі вельмі добрых фотаапаратаў, акрамя таго, якасныя і цікавыя здымкі можна рабіць і айфонам. Але я не прафесіянал. Аматар, такі як я, можа сабе дазволіць фатаграфаваць усё, што хоча, а прафесіянал — не.

Яшчэ сем гадоў таму творца падумаць не мог, што будзе выстаўляцца на такой значнай для Беларусі пляцоўцы. І сваім гледачам ён раіць атрымліваць асалоду ад жыцця.

Вікторыя АСКЕРА

Прынцып Фалька,

альбо «Лятучая мыш», якую не чакалі

…Князь-мецэнат прагне задавальненняў. Пра помсту марыць злапамятлівы адвакат, які пабываў аднойчы на балі ў касцюме Кажана і потым раніцой ішоў праз увесь горад з-за таго, што сябра яго пакінуў. Сябра-банкір шукае любоўных прыгод, нягледзячы на тое, што ёсць жонка. Ды і яна не супраць прыняць дома закаханага юнака, пакуль няма мужа... Штраус пісаў сваю аперэту «Лятучая мыш», ведаючы элітны свет знутры: норавы знатных ды заможных асоб могуць шакаваць цынізмам. Ды няўжо?!

Усяго нейкіх паўтара стагоддзя — і акалічнасці справы Генрыха фон Айзенштайна падаюцца мілай прыгодай (у параўнанні з тым, што чуе і бачыць штодня сучасны чалавек з адкрытых крыніц), не вартай асаблівай размовы. Ну, хіба што асаблівай трактоўкі.

Яе і чакалі аматары Вялікага тэатра Беларусі з пачатку сезона, калі прэм'ера толькі анансавалася. А тыя, хто ходзіць у Нацыянальны акадэмічны тэатр оперы і балета Беларусі больш чым паўвека, маглі чакаць новую пастаноўку, каб параўнаць спектаклі сярэдзіны мінулага стагоддзя і пачатку XXI, — і мелі падставу ўзрадавацца таму, што рэінкарнацыя магчымая (што само па сабе добрая навіна). Сапраўды, «Лятучая мыш» ішла на гэтай сцэне ў 60-я гады мінулага стагоддзя. Але тады ў Беларусі яшчэ не было дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра, які ўзяў на сябе пастаноўкі ў гэтым жанры, пакінуўшы Вялікаму больш элітную музыку — оперы і балеты. Але як музычнаму тэатру захацелася выйсці за межы і там сталі з'яўляцца, напрыклад, балеты, так цяпер і оперны, здаецца, вырашыў своеасаблівым чынам паспрачацца з музычным, дзе ёсць аперэта «Лятучая мыш».

З пункту гледжання аматара тэатра ў гэтым была нават пэўная інтрыга, бо калі тут бяруцца за «класіку жанру» Іагана Штрауса, то пастаноўка павінна быць такога ўзроўню, каб ні ў кога не ўзнікала пытанняў: а навошта гэта трэба Вялікаму?

Гэтае пытанне засталося пасля прэм'еры спектакля, у якім нечакана спраўдзіліся ўсе звычайныя чаканні, з якімі звязваецца ў свядомасці як сам жанр аперэты, так і яго існаванне ў Беларусі. І нельга ж сказаць, што гэтая аперэта — не для опернага. Усё залежыць ад таго, як, бо спяваць ёсць што. Калі за тую ж «Лятучую мыш» узяліся у Вялікім тэатры Расіі гадоў дзесяць таму, то ўсё-такі спрабавалі вырвацца з класічнай мышалоўкі і прапанавалі іншы погляд на жыццё эліты, якая патанае (сцэнографам «Тытаніка», дарэчы, быў наш Зіновій Марголін). Праўда, тую пастаноўку не надта віталі: рабіць інтэрпрэтацыю заўсёды больш рызыкоўна, чым прапанаваць класічны варыянт.

І калі ўжо пасля скандалаў вакол пастаноўкі ў расійскім Вялікім наш тэатр узяўся за гэтую работу, прыцягнуўшы замежную каманду пастаноўшчыкаў, то думалася, што варта чакаць калі і не разрыву шаблону, то хоць бы парушэння звыклага ўяўлення пра аперэту як пра жанр, які асацыюецца з легкадумнасцю, бесклапотным і ненапружным баўленнем часу.

Калі хто чакае (ці баіцца) высокадумнай інтэрпрэтацыі, то можна расслабіцца: яе няма. Ды і нейкай інтэрпрэтацыі няма наогул. Рэжысёр-пастаноўшчык з Венгрыі Міклаш Габар Керэні, звярнуўшыся да першакрыніцы, пайшоў зададзеным Штраусам шляхам. От жа, а дзеля чаго, калі не дзеля хітовай музыкі яшчэ ставяць «Лятучую мыш»?.. Наўрад ці дзеля інтрыг ды жарсцяў вакол сужэнскай здрады, пра што спяваюць і гавораць героі, — гэта ўсё цяпер даступна дзякуючы танным тэлесерыялам, і нават не трэба нікуды хадзіць за грошы.

Гавораць тут шмат (часам занадта, нейкія дыялогі цяпер падаюцца штучнымі і наіўнымі). Але з драматычнымі задачамі артысты оперы ў прынцыпе спраўляюцца, а часам падаецца, што яны захопленыя ігрой на сцэне, каб выканаць задумы рэжысёра. Калі трэба, могуць выйсці ў карункавай бялізне пры тым, што Разілінда ў выкананні народнай артысткі Беларусі Настассі Масквіной і без гэтага выдатна ўспрымаецца як легкадумная гарэза. Ці гатовыя сесці ў ванну ў майках, як Аляксандр Гелах у ролі закаханага Альфрэда. Праўда, яны яшчэ і спяваюць пры гэтым, імкнучыся трымаць планку выканальніцкага майстэрства. Іх дуэт гучаў даволі рамантычна, але думкі пра пачуцці калі і ўзніклі, то ненадоўга. Бо тут жа на сцэне з'явілася «падтанцоўка» — дзяўчаты ў шорціках і панчохах у сетачку, згодна са стэрэатыпамі жанру, — нібыта без яе легкадумнасць герояў невідавочная. Такая «аперэтачная» (у дадзеным выпадку маецца на ўвазе ні ў якім разе не сам жанр, а яго вельмі плоскае ўвасабленне) падтанцоўка будзе шмат дзе: і дома ў Айзенштайнаў, і на балі ў князя Арлоўскага.

Гэта яшчэ адзін цікавы персанаж: з голасам мецца-сапрана (Кацярына Міхнавец) — як і прапісана Штраусам. Ох, гэтыя рускія мецэнаты, якія калісьці скаралі Еўропу, напэўна, моцнае ўражанне пакідалі... Але ў нейкі момант на сцэне князь паказваецца ў сукенцы (але ж у віры балю магло і прымроіцца). Рускі князь — вялікі арыгінал і ў тым, як ладзіць баль, паводле венгерскага рэжысёра-пастаноўшчыка. Відаць, яго ўяўленне пра магчымыя балі рускіх мецэнатаў жыве з колішніх часоў: гасцей вітаюць балетныя мышкі ды… мядзведзі (стэрэатып, які, здавалася б, у XXI стагоддзі ўжо трэба забыць). А Разалінда ў чырвонай сукенцы ды яе муж (артыст Васіль Мінгалёў) для нас — фактычна героі задуманага Фалькам рэаліці-шоу, якое адбываецца ў нейкай кабацкай атмасферы, улічваючы, што запрошаная на яго ўсё ж венская эліта. І таму венгерскі нумар Разалінды з дзяўчатамі ў фальклорных строях з блакітнымі арнаментамі (якія больш падобныя не на яркія венгерскія, а на стрыманыя беларускія) уступіў у дысананс з усім, што адбывалася дагэтуль. Але перакрыць градус, нават вонкава ўзняты танцорамі з мядзведжымі галовамі, было ўжо складана. Пры тым, што менавіта гэты нумар Разалінды павінен быць кульмінацыяй, абгрунтаваннем цікавасці банкіра да жанчыны ў чырвонай сукенцы, ад якой ён, сам таго не ведаючы, збег на баль.

Каб перадаць бляск і маральную нікчэмнасць вечарынак для заможных асоб, зроблена канструкцыя, якая круціцца і стварае ўражанне вялікага палаца (мастак-сцэнограф Тамаш Ракаі), адпаведна і строі герояў павінны былі працаваць на гэта (мастак па касцюмах Агнеш Ева Дзермаці): усё-такі гуляе венская эліта, да якой належаць банкіры Айзенштайны. Але ў добры густ Разалінды, якая можа дазволіць сабе ўсё самае лепшае, чамусьці не верыцца пасля таго, як яна называе прыгожай стракатую і пошлую сукенку, у якой потым паедзе на баль яе служанка Адэль. І гэта пры тым, што сама Разалінда гэты строй замаўляла зусім не для вечарынкі і наогул туды першапачаткова не збіралася. Аднак падазраю, што знойдуцца і тыя, хто пагодзіцца з гераіняй і назаве яе густ элітным, а саму гісторыю ўспрыме як забаўны розыгрыш — тое, што ўсяго толькі і атрымалася ў запрошанага рэжысёра, нягледзячы на яго заяўкі пра адмысловую трактоўку з канцэптуальным падыходам. Па факце канцэпцыі няма. Ніякага адкрыцця не адбываецца (я цяпер не пра сюжэт, які і так добра вядомы, а пра танную рэалізацыю — паводле рэжысёрскай задумы: і тут гаворка не пра сродкі, якія затрачаныя на прэм'еру з удзелам замежнай каманды). Аднак прэм'ера адбылася, птушачку паставіць можна.

Але дзеля чаго гэта рабілася? Магчыма, каб тэатр прыцягнуў новую для сябе публіку — тую, якая ніколі не была ў Вялікім, бо баіцца элітных мастацтваў, такіх, як опера ці балет. У той час як у аперэце дыялогі чаргуюцца са спевамі, а музыка Штрауса дае адчуванне, нібыта ты сам пабываў на балі (для гэтага дастаткова проста яе слухаць, а не глядзець). Дык, верагодна, быў зроблены разлік на касу: чым больш эклектычна, страката і ярка, тым проста больш?..

Ці не атрымалася, што тэатр выкарыстаў прынцып героя Фалька, які загнаў у пастку галоўных герояў дзеля вырашэння ўласных праблем чужымі рукамі? Вось толькі спектакль Фалька аплаціў заможны замежнік, а спектакль тэатра, наадварот, аплачвалі замежніку. Розніца істотная. У выніку ў пастцы пачуваюцца шчырыя прыхільнікі опернага, якія ў гэтай цёмнай зале шукаюць святло мастацтва і не хочуць станавіцца пакрыўджанымі кажанамі. А новыя гледачы, што прыйдуць (магчыма) на «Лятучую мыш», рызыкуюць потым аслепнуць ад святла, як тыя кажаны… Дык хто ў выніку трапіў у пастку?

Ларыса ЦІМОШЫК

Недалёка ад развітання

З героямі спектакля «Недалёка ад нормы» тэатра «Тэрыторыя мюзікла» айчынныя гледачы пазнаёміліся крыху больш чым год назад. І даволі высока ацанілі пастаноўку, здзейсненую рэжысёрам Настассяй Грыненкай. Па выніках мінулага года спектакль «Недалёка ад нормы» атрымаў беларускую Нацыянальную тэатральную прэмію ў намінацыі «Найлепшы спектакль у жанры аперэты, музычнай камедыі, мюзікла». Тэатр «Тэрыторыя мюзікла» пры гэтым стаў першым прыватным тэатрам, які быў адзначаны такой высокай узнагародай за ўсю гісторыю прэміі. Паводле айчынных крытыкаў, якія складаюць свой рэйтынг, мюзікл «Недалёка ад нормы» ўвайшоў у Топ-10 самых цікавых пастановак 2018 года.

І сапраўды, гэта спектакль з сюжэтам, зусім нетыповым для мюзіклаў: галоўная гераіня пакутуе ад біпалярнага расстройства, няпроста прыходзіцца і яе блізкім, якія любяць і хочуць адчуваць яе любоў. Але захворванне мяняе жыццё сям'і, мяняе і саміх герояў, у тым ліку і іх стаўленне да таго, што значыць «нармальны» чалавек. Ці рэальна вызначыць мяжу, калі норма пераходзіць у адхіленне?.. Пра гэтыя перажыванні і думкі не проста распавядаюць артысты, а спяваюць у суправаджэнні рок-гурта пад кіраўніцтвам Ціхана Золатава, што іграе жыўцом. За кошт гэтага дасягаецца найбольш моцнае эмацыянальнае ўздзеянне на гледача.

Але час жыцця на беларускай сцэне ліцэнзійнага брадвейскага мюзікла скончыцца 16 ліпеня, калі ў тэатры «Тэрыторыя мюзікла» пройдзе апошні паказ спектакля, створанага пры падтрымцы Пасольства ЗША ў Рэспубліцы Беларусь. Згодна з умовамі ліцэнзіі, мюзікл «Недалёка ад нормы» атрымаў усяго 20 паказаў на беларускай сцэне.

На радзіме мюзікл быў прызнаны адным з лепшых за апошнія дзесяць гадоў, атрымаў 11 намінацый і 3 прэміі ў галіне музычнага тэатра *TonyAward* і Пулітцэраўскую прэмію ў намінацыі «Драма» за пашырэнне магчымасцяў і тэматыкі самога жанру. За год пастаноўку паглядзелі не толькі жыхары Мінска, але таксама і госці з гарадоў Беларусі і Расійскай Федэрацыі.

Марыя АСІПЕНКА

Дзейснасць неабыякавасці

на V фестывалі «Паўночнае ззянне»

Ці ёсць у нас кінатэатры, дзе можна глядзець добрае сучаснае кіно, скіраванае не на тое, каб забаўляць, а на тое, каб задаваць пытанні, размаўляць з намі асаблівай мовай кінамастацтва?.. Звычайна айчынныя кінагурманы чакаюць фестываляў, дзе будуць прадстаўлены новыя адметныя фільмы беларускіх і замежных рэжысёраў. Яны ведаюць, што вясной у Беларусі адбываецца «Паўночнае ззянне». Сёлета V фестываль кіно Паўночных і Балтыйскіх краін падарыў яркія ўражанні ад карцін і сустрэч.

У праграму ўвайшлі васямнаццаць гульнявых і дакументальных фільмаў, рэтраспектыва, дзіцячая праграма «Ззя-*kids*», а таксама больш чым дзесяць мерапрыемстваў індустрыяльнай платформы, што варта асаблівай увагі: у гэтага фестывалю пераважна маладая актыўная аўдыторыя, неабыякавая да стану айчыннай кінематаграфіі і зацікаўленая ў яе развіцці.

Традыцыйна «Паўночнае ззянне» прадставіла фільмы са Швецыі, Нарвегіі, Даніі, Фінляндыі, Ісландыі, Эстоніі, Літвы і Латвіі. Звычайна арганізатары стараюцца рабіць сюрпрызы, і калі летась у праграму ўключылі фільм з Фарэрскіх астравоў, то сёлета ўпершыню ў Беларусі паказалі стужку з Грэнландыі. Мы спынімся толькі на некаторых карцінах, паказ якіх пакінуў не толькі кінаўражанні, але і ўцягваў у жывую размову пра жыццёвыя з'явы, выклікаў дыскусіі і нават працаваў на будучыню.

ІГРАВОЕ

Вялікую цікавасць у гледачоў выклікаў фільм «Вакацыі» ад рэжысёра з Даніі Ізабэлы Эклёф. Фільм распавядае пра маладую дзяўчыну, якая аказалася ў гвалтоўных стасунках з наркабаронам. Стужка ўздымае тэму становішча ахвяры, выклікае пытанні, чаму і калі гвалт магчымы. Вострасюжэтная драма захапляе дынамікай сюжэта, які падмацаваны эмацыянальным напалам. Даволі прамое аўтарскае выказванне абуджае думкі пра тое, на чым увогуле трымаецца сістэма залежнасці чалавека ад пэўных стасункаў? Ці магчыма прадбачыць развіццё сітуацыі і не трапіць у разрад ахвяр ужо ў рэальным жыцці? Такім чынам, кінатвор, як ні парадаксальна, скіраваны на пераўтварэнне рэчаіснасці ў лепшы бок.

Пасля паказу карціны адбылася сустрэча гледачоў з рэжысёрам, якая распавяла пра сузалежныя адносіны. На яе думку, такі фармат дазваляе зрабіць так, каб чалавек быў папярэджаны пра небяспеку і па пэўных момантах у сваім жыцці мог разумець, што трэба быць асцярожным, своечасова паспрабаваў прадухіліць бяду.

Актыўны водгук кінааўдыторыі атрымала эстонская іграваая стужка рэжысёра Лійны Трышкінай-Ванхатала «Бяры ці бяжы», якая ад Эстоніі змагалася за «Оскар». Сюжэт адначасова і жахлівы, і вельмі цёплы. Аднойчы ў лагодную суботу 30-гадовы будаўнік Эрык атрымаў ашаламляльную навіну: яго былая дзяўчына Маоніка, з якой ён не бачыўся ўжо шэсць месяцаў, хутка народзіць дзіця. Яна, аднак, не гатовая стаць маці, і калі Эрык не захоча ўзяць адказнасць на сябе, маленькая дзяўчынка будзе аддадзеная на ўдачарэнне. Таму хлопец вырашыў забраць дзіця. Падчас выхавання мужчына сутыкнуўся з безліччу праблем. Жаночай дапамогі ў яго не было наогул, і ён неаднойчы думаў, што дарэмна забраў дачку…

Рэжысёр паказвае, як змяняецца жыццё, калі пачынаеш любіць па-сапраўднаму, дэманструе, як адбываецца трансфармацыя чалавечай сутнасці. Гэты фільм немагчыма знайсці на прасторах інтэрнэту, таму гледачам вельмі пашанцавала ўбачыць яго ў Мінску.

Фільм «Жанчына аб'яўляе вайну» рэжысёра Бенедыкта Эрлінгсана (Украіна, Ісландыя, 2018 г.) вельмі актуальны для сучаснага свету, нездарма адзначаны двума

Кадр з фільма «Жанчына аб'яўляе вайну».

прызамі на тыдні крытыкі ў Канах — 2018. Галоўная гераіня — пяцідзесяцігадовая абаронца навакольнага асяроддзя — аб'явіла вайну алюміневай прамысловасці Ісландыі. Яе жыццё поўнасцю перавярнулася пасля таго, як яна атрымала дазвол на ўдачарэнне маленькай дзяўчынкі з Украіны. Нечакана за сваю дзейнасць жанчыну забіраюць у турму. Калі да яе на спатканне прыходзіць сястра-блізнец, жанчыны мяняюцца адзеннем. Фільм канчаецца кадрамі, як украінскі аўтобус, дзе едзе Хала і яе дачка, спыняецца і высаджвае іх. Але далей няма дарогі: яе заліла рака, якая выйшла з берагоў… Так аўтар падыходзіць да драматычнай тэмы самаідэнтыфікацыі асобы, якая спрабуе нешта змяніць у свеце і блукае ў пошуках новага дома, новай радзімы, новай сутнасці.

Псіхалогія чалавека — падстава для даследавання рэжысёра Марыі Каўгарадзэ (Літва, 2019) у стужцы «Перажыць лета». Галоўная гераіня фільма Індрэ, маладая даследчыца-псіхолаг, якая неахвотна згаджаецца перавезці двух пацыентаў з адной псіхіятрычнай клінікі ў другую ў абмен на магчымасць весці навуковую працу, раптам аказваецца завадатарам у групе падчас доўгага падарожжа да мора. Яна назірае за гаваркім маладым чалавекам з біпалярным разладам, які моцна кантрастуе з інтравертнай дзяўчынай, чые раны схаваны ад чужых вачэй. Але яны абодва вядуць унутраную барацьбу, разам шукаюць выратавання. Тое, што выглядае як бесклапотнае летняе падарожжа з сябрамі, становіцца для іх пачаткам адраджэння. Чуллівая гісторыя напоўнена нечаканасцямі і надзеямі на тое, што ў свеце няма нічога немагчымага. Карціна паказвае, як у складанай сітуацыі два абсалютна розныя чалавекі пачынаюць існаваць супольна, становяцца як адно цэлае. Кіно з болем, але ў той жа час і з верай у людзей.

Кадр з фільма «Вакацыі».

ДАКУМЕНТАЛЬНАЕ

Прыемна пачынаць размову пра дакументальнае кіно з беларускай карціны. На фестывалі адбылася прэм'ера фільма «Мая бабуля з Марса» рэжысёра Аляксандра Міхалковіча, які падзяліўся асабістай гісторыяй. Яго бабуля Зіна жыла ва Украіне, Расіі, Беларусі, але пасля таго, як выйшла на пенсію, пераехала ў Крым. Моцная і поўная жыцця, яна заўжды яднала сваю вялікую сям'ю. Але пасля геапалітычных зменаў ва Украіне наведваць яе стала выпрабаваннем для ўнука.

Сталаму чалавеку не проста прыняць новыя рэаліі — бабуля стала пачувацца больш разгубленай і самотнай. Дзеля таго каб падтрымаць яе, прадстаўнікі сям'і, раскіданыя па розных краінах свету, сабраліся разам павіншаваць бабулю з 80-годдзем. З аднаго боку, вельмі простая, а з другога — глыбокая гісторыя, заснаваная на базавых для чалавека пачуццях дабрыні, еднасці, павагі. Але ў сямейную гісторыю ўключаны іншы кантэкст: немагчыма абысці пэўныя геапалітычныя падзеі, і героі выказваюць сваё стаўленне да такіх з'яў, як вайна, здрада, справядлівасць. Такім чынам, фільм, якога мы не ўбачылі ў мінулым годзе на кінафестывалі «Лістапад», усё адно прыйшоў да айчыннага гледача, праўда, ужо пасля таго, як з поспехам быў паказаны на еўрапейскіх фестывалях.

Геапалітыка паўплывала на жыццё герояў дакументалкі Грымура Хоканарсана «Маленькая Масква» (Ісландыя, 2018). Фільм паказвае існаванне людзей на адной прасторы пасля важных гістарычных падзей. У гады халоднай вайны Ісландыя была краінай заходняй дэмакратыі. Злучаныя Штаты ўсталявалі на востраве базу, і Ісландыя ўвайшла ў склад НАТА. Кааліцыя правацэнтрысцкіх партый кіравала дзяржавай і ўсімі гарадскімі саветамі. Акрамя аднаго, на чале маленькага горада Нэскёйпстадур, у якім пражывала каля 1500 чалавек, стаялі сацыялісты. Яны прыйшлі да ўлады ў 1946-м і трымалі яе на працягу 52 гадоў. Фільм распавядае пра тое, як жыве маленькі гарадок у XXI стагоддзі. Тут прысутнічае аповед пра сацыяльную інфраструктуру, дэталёва разбіраецца побыт. Але галоўная адсылка — да ўнутранага стану жыхароў горада, які так адрозніваецца ад іншых у гэтай краіне.

Актыўныя грамадскія дыскусіі ў свеце выклікала дацкая карціна рэжысёра Мары Скаўгорд «Рэфарміска». Гэта фільм-развага пра іслам і месца, якое надае гэтая рэлігія жанчыне. Галоўная гераіня Шэрын Ханкан адкрыла першую ў Еўропе мячэць, лідарамі ў якой сталі жанчыны. Яны імкнуцца супрацьстаяць эмоцыям жаху, якія звязваюцца з мусульманамі, і кідаюць выклік распаўсюджаным меркаванням, заклікаючы да талерантнай ды гендарнай інтэрпрэтацыі Карана. Шэрын нецярплівая. Яна хоча перамен і роўнасці тут і цяпер. Але як можна разбурыць за адну ноч традыцыі, уласцівыя рэлігіі, што мае гісторыю ў некалькі стагоддзяў? Шэрын адкрыта пачынае ажыццяўляць ісламскія разводы па просьбе няшчасных у сямейным жыцці жанчын і заключае міжканфесійныя шлюбы паміж жанчынамі-мусульманкамі і мужчынамі-немусульманамі. Яе паспешнасць падводзіць арганізацыю да мяжы краху…

Балючыя, няпростыя пытанні сучаснасці аналізуе сёння кіно, не баіцца казаць пра пошукі і памылкі: лепш з імі сутыкацца праз экран, чым у рэальнасці.

ДЗІЦЯЧАЕ

Кадр з мультфільма «Якаб, Мімі і сабакі, якія размаўляюць».

Літоўская і нарвежская анімацыя з беларускай агучкай у межах новай дзіцячай праграмы «Ззя-*kids*» стала добрым сюрпрызам для сямейнага прагляду, а таксама прыкметай росту кінафестывалю. Напрыклад, адбыўся паказ мультфільма «Якаб, Мімі і сабакі, якія размаўляюць» легенды латвійскай анімацыі Эдмундса Янсанса, які распавядае аб прыгодах хлопчыка ў самым аўтэнтычным раёне Рыгі. Калі тата прывозіць Якабса ў прыгарад на лета, хлопчык не толькі знаёміцца з наваколлем, якога ён ні разу ў жыцці не бачыў, але і знаходзіць новых сяброў — стрыечную сястру ўсёзнайку Мімі і дзядзьку Кіта, былога марака. Акрамя таго, ён сустракае Боса, лідара зграі сабак, што размаўляюць па-чалавечы. Гэта цікавая кампанія аб'ядноўваецца, каб выратаваць прыгарад ад багацея Калабка, які плануе ператварыць рамантычнае месца — адзін з самых старажытных раёнаў Рыгі — у бяздушныя джунглі хмарачосаў і шкла.

З аднаго боку, вельмі цікавы лёгкі мультфільм, а з другога — інтэлектуальны і стваральны, вучыць дзяцей успрымаць арганічнасць навакольнага асяроддзя і клапаціцца пра яго захаванне. Актыўная пазіцыя да жыцця выхоўваецца з дзяцінства, лічаць кінамайстры. Маюць рацыю.

Мультфільм «Вясёлая ферма», зняты нарвежскім кінарэжысёрам Лізэ І. Уосвалам, нагадвае прыклад класічнага добрага анімацыйнага фільма, які, здавалася б, дазваляе проста адпачыць. Галоўная гераіня сюжэта — маленькая карова, якая жыве ў горадзе са сваёй мамай і марыць стаць рок-зоркай. Аднойчы яна атрымлівае ліст ад свайго бацькі, якога не бачыла шмат гадоў, і выпраўляецца ў вёску, каб сустрэцца з ім. Там яна дапамагае выратаваць татаву ферму ад прагнага бізнесмена, знаходзіць свайго першага сапраўднага сябра і разумее, што зоркай можна стаць не толькі ў музыцы, але і ў звычайным жыцці. Вось такая філасофія: ужо з маленства можна скіраваць чалавека да глыбокіх думак пра тое, што адбываецца вакол.

Выхаванню праз мастацтва паспрыяў і майстар-клас «Справа мары», які правяла Валерыя Манковіч, аўтарка курсаў комікса творчых майстэрняў галерэі «Ў». Маленькім удзельнікам прапанавалі паразважаць пра тое, якія прафесіі з'явяцца праз 10—15 гадоў, і зрабіць візуалізацыю сваёй мары ў выглядзе комікса. Цікава, таму што гэта людзі, якім належыць будучыня. Іх уяўленне пра свет — клопат цяперашніх дарослых, іх задача — пераўтварыць прастору жыцця, дзе шмат што імкнецца да гарманізацыі.

Гэта адлюстроўвае кіно неабыякавых — аўтараў і гледачоў. Фільмы «Паўночнага ззяння» сёлета карысталіся ўвагай, квіткі на многія стужкі раскупалі адразу.

Вікторыя АСКЕРА

Планета маладосці

На арбіце харавога свята «Спявай, мая сталіца»

На працягу пяці гадоў Мінскае харавое свята «Спявай, мая сталіца» ўпрыгожвае культурнае жыццё горада. Сёлета III Мінскае харавое свята «Спявай, мая сталіца», арганізаванае каледжам імя Міхаіла Глінкі пры падтрымцы ўпраўлення культуры Мінгарвыканкама, прысвечана 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, а таксама 95-годдзю заснавання Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя Міхаіла Глінкі.

У вялікай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі аматары і прыхільнікі харавога мастацтва мелі магчымасць пачуць музыку, якая кранае нашы сэрцы і выклікае пачуцці ўдзячнасці і глыбокай павагі да ўсіх, хто набліжаў Перамогу, а таксама далучыцца да музыкі, якая натхняе і акрыляе цяпер.

Любоў да Радзімы і музычнага мастацтва аб'яднала харавыя калектывы дзіцячых музычных школ мастацтваў №№ 1, 4, 7, 9, 10, 12 г. Мінска, Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя Міхаіла Глінкі, аркестр рускіх народных інструментаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі пад кіраўніцтвам Уладзіміра Чэрнікава, які на працягу кожнага свята, пачынаючы з 2015 года, з'яўляецца актыўным яго ўдзельнікам. Гістарычная старонка правядзення харавых святаў дапоўнілася сёлета гучаннем інструментальнага гурта каледжа пад кіраўніцтвам Алеся Собаля ў складзе Юліі Купрыянавай (гітара), Аляксандра Пінчука (бас-гітара) і самога кіраўніка (ударныя).

Адкрылася свята беларускай народнай песняй «З далёкіх, з краёў». У першым аддзяленні канцэрта ў выкананні зводнага хору Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя Міхаіла Глінкі (кіраўнікі Аляксей Снітко, Кіра Славінская) і аркестра рускіх народных інструментаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі (мастацкі кіраўнік і дырыжор, кіраўнік праекта Уладзімір Чэрнікаў) прагучалі песні ваенных гадоў Ігара Лучанка, Уладзіміра Алоўнікава, Булата Акуджавы, Уладзіміра Высоцкага, Ісака Любана, Анатоля Новікава, Кірыла Маўчанава. Упершыню на сцэне Белдзяржфілармоніі ў суправаджэнні мужчынскай групы хору гучаў голас саліста, выпускніка каледжа Ільі Самаля падчас выканання песні Ігара Лучанка «Памяць сэрца». У песні Булата Акуджавы «Але нам патрэбна адно перамога» саліравала Арына Воляк, а «Майскі вальс» Ігара Лучанка выконваў Арцём Хамічонак.

Зводны хор III Мінскага харавога свята «Спявай, мая сталіца!» Дырыжор, галоўны хормайстар — Аляксей Снітко.

У складзе зводнага хору пачэснае месца займалі творчыя калектывы каледжа: змешаны хор спецыяльнасці «Спевы акадэмічныя» (мастацкі кіраўнік Кіра Славінская), канцэртны хор спецыяльнасці «Дырыжыраванне (акадэмічны хор)» і ўладальнік заахвочвальнай прэміі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі жаночы камерны хор «Канцэрціна» (мастацкі кіраўнік Аляксей Снітко).

Другое аддзяленне канцэрта стала сапраўдным феерверкам гучанняў галасоў больш як паўтысячы юных удзельнікаў узорных харавых калектываў дзіцячых музычных школ мастацтваў г. Мінска і навучэнцаў Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя Міхаіла Глінкі. Невыпадкова праграма другога аддзялення свята «Спявай, мая сталіца» адкрылася песняй Алега Храмушына «Колькі нас?» (дырыжор Аляксей Снітко). Канцэртмайстарскае мастацтва паказвалі адначасна на дзвюх раялях Марыя Троць і Яўген Гальцаў.

Разам з выканаўцамі слухачы акунуліся ў свет дзяцінства, радасці і прыгод, успомнілі знаёмыя песні Уладзіміра Шаінскага «Калі мае сябры са мной» з кінастужкі «Па сакрэце ўсяму свету» (дырыжор Алена Барабіцкая), Ігара Лучанка «Дабрыня» (дырыжор Марына Кашпур, салісты Андрэй Кучынскі і Арына Рапавец), Яўгена Крылатава «Крылатыя арэлі» з кінастужкі «Прыгоды Электроніка» (дырыжор Вольга Крыпец).

Тэма сувязі пакаленняў гучала ў творах Ігара Лучанка «Пакланіцеся, унукі, дзеду» (дырыжор Галіна Аерава) і Эдуарда Зарыцкага «Нас яднае хор» (дырыжор Аляксей Клімовіч) у выкананні ўзорнага хору «Дэцыма» і хору «Музычныя пацеркі» Дзіцячай музычнай школы мастацтваў № 10 г. Мінска, а таксама Алены Атрашкевіч «Час выбраў нас» — з удзелам узорнага хору «Тоніка» Дзіцячай музычнай школы мастацтваў № 1 імя Л. Александроўскай г. Мінска (дырыжор Аляксей Снітко).

Харавое свята — гэта заўсёды «парад» не толькі спеўных калектываў, але і хормайстраў. На чале гэтага «спеўнага поля», створанага навучальнымі ўстановамі ў рамках святкавання гістарычных для краіны падзей, вылучалася выкананне вядучых калектываў Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя Міхаіла Глінкі: канцэртнага хору з творам Міхаіла Глінкі «Спадарожная песня» (дырыжор Аляксей Снітко) і жаночага хору «Мелодыка» з песняй Уладзіміра Высоцкага «Так здарылася — мужчыны сышлі» (дырыжор Вольга Крыпец).

Завяршыла прызнанне ў любові да сталіцы песня «Мінск» Алены Атрашкевіч на словы Барыса Макарэвіча, праспяваная зводным хорам (дырыжор і галоўны хормайстар свята Аляксей Снітко) у суправаджэнні канцэртмайстраў — кампазітара Алены Атрашкевіч і Яўгена Гальцова, інструментальнага гурта каледжа пад кіраўніцтвам Алеся Собаля. Падарункам для гледачоў і ўдзельнікаў свята стала асабістае выкананне за раялем кампазітара Алены Атрашкевіч падчас прэм'еры новай песні, з якой мы крочым у будучыню нашай сталіцы, маладзеем разам з ёй, спяваем і марым быць шчаслівымі:

Мінск — планета маладосці,
Горад промняў залатых.
Мінск — краіна прыгажосці,
Казка светлая на ўсіх!

Наталля КАРДАШОВА

выДАТна

Рапсодыя моладзі

Традыцыя працягваецца тады, калі ёсць каму яе падхапіць. А ў музыцы, акрамя жадання гэта рабіць, патрэбна яшчэ і далучэнне да майстэрства, што назапашваецца гадамі. Поспехі ў музычнай школе, каледжы ці вучэльні вядуць да грунтоўнай прафесійнай падрыхтоўкі, у ВНУ, дзе традыцыя злучаецца з прафесіяй. Наколькі гэта патрэбна — была нагода разважаць падчас канцэрта Беларускага народнага аркестра БДУКМ, які адбыўся ў зале імя Рыгора Шырмы Белдзяржфілармоніі.

Гэты аркестр сёлета адзначае 40 гадоў з моманту заснавання. Прычым неабходнасць стварэння падобнага калектыву ў навучальнай установе зразумелі ўсяго праз чатыры гады пасля яе адкрыцця. Аркестр стаў творчай майстэрняй для студэнтаў, дзе яны вучацца злучаць індывідуальнае майстэрства і калектыўную працу. Але самае каштоўнае — гэта дае працяг музычнай традыцыі, таму што студэнты, выканаўцы аркестра, пасля выпуску стануць музычнымі асветнікамі, здольнымі зачараваць гучаннем цымбалаў, баяна ці балалайкі.

Музыка для іх ёсць — і ствараецца сёння. І музыкі ёсць, гатовыя выканаць не толькі народныя мелодыі ды песні, а нават складаныя творы сучасных айчынных кампазітараў, такіх як Яўген Глебаў, Дзмітрый Смольскі, Аляксей Туранкоў, Генадзь Ермачэнкаў, Вячаслаў Кузняцоў, Уладзімір Кур'ян ды іншыя. З твораў айчынных ды замежных кампазітараў аркестр стварыў асобныя праграмы. А падчас святкавання чарговага дня нараджэння паказаў, што здольны выступаць з выдатнымі салістамі, такімі як заслужаныя артысты Рэспублікі Беларусь Аляксандр Крамко (выканаўца на народных духавых інструментах) і Уладзімір Ткач (баян), малады баяніст-віртуоз Уладзіслаў Плігаўка, цымбаліст Дзмітрый Калаціла, Вячаслаў Помазаў (флейта), Марына Ільіна (балалайка) ды іншымі. І нават кітайскія салісты, як Ван Сяатун (эрху) ды Чэнь Шэнцзун (скрыпка), упісаліся ў агульнае гучанне, каб стварыць музыку з адметным каларытам.

Узровень калектыву, мастацкім кіраўніком і галоўным дырыжорам якога сёння з'яўляецца Віктар Валатковіч, высока ацэнены ў Беларусі і за межамі. Аркестр атрымаў Гран-пры Міжнароднага конкурсу ў Санкт-Пецярбургу, станавіўся ўладальнікам Гранд-прэміі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Марыя АСІПЕНКА

Плён пераўтварэнняў

Як звычайную музычную школу ператварыць у асобны навучальны комплекс, дзе вучаць музыцы і харэаграфіі? Адказ ведае Людміла Мішчанка, якая больш чым 35 гадоў (з 1980 па 2017) узначальвала Магілёўскую дзяржаўную гімназію-каледж мастацтваў. У гонар педагога, заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь на сцэне вялікай залы Белдзяржфілармоніі 26 мая адбудзецца канцэрт-віншаванне: Людміла Аляксееўна сёлета адзначае 80-годдзе.

Яна, нібыта чалавек адраджэння, працавала найперш для людзей, і гэта дало фантастычны плён. Працавала на якасць адукацыі, разумела неабходнасць рэфармавання навучальнага працэсу, злучэння яго з інавацыйнымі падыходамі, прыцягнула выдатных выкладчыкаў, якія таксама адчувалі неабходнасць зменаў у адукацыі творцаў. І вынікам стала адраджэнне навучальнай установы, яе існаванне на новым узроўні. У 1991 годзе на базе музычнай школы № 1 у Магілёве быў створаны ліцэй музыкі і харэаграфіі, які 23 красавіка 1998 года рашэннем Магілёўскага гарадскога выканаўчага камітэта быў ператвораны ў навучальны комплекс гімназія-каледж музыкі і харэаграфіі, а ў 2004 г. — ва ўстанову адукацыі «Магілёўская дзяржаўная гімназія-каледж мастацтваў». За 37 гадоў, будучы яе кіраўніком, Людміла Мішчанка здолела наладзіць працу так, каб сюды прыходзілі найбольш таленавітыя дзеці. Не адно пакаленне выхавана, не адно імя загучала на ўсю Беларусь. Пётр Ялфімаў, Іскуі Абалян, Наталля Падольская пачыналі свой шлях у музыцы ў Магілёве. Навучальная ўстанова набыла славу не толькі ў сваім горадзе, але і ва ўсёй краіне ды нават за яе межамі. А Людміла Мішчанка стала ганаровым грамадзянінам горада Магілёва.

І зразумела, чаму ў юбілейным канцэрце возьме ўдзел Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча пад кіраўніцтвам Міхаіла Дрынеўскага. Ды ўсё ж самыя дарагія віншаванні і падарункі для настаўніка — ад вучняў, выпускнікоў і цяперашніх навучэнцаў Магілёўскай дзяржаўнай гімназіі-каледжа мастацтваў, сярод якіх, у прыватнасці, будуць Пётр Ялфімаў і Маймуна Дзіко. Выйдуць на сцэну таксама ўзорны тэатр танца «Ірыс-шоу» і заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь тэатр эстрады «Сябрынка».

Марыя АСІПЕНКА

Скарбонка Спадчыны

Фота Юрыя Івановіча.

Юрый Боўда прадстаўляе свае вырабы.

Звініць як званочак

посуд, зроблены на ганчарным крузе бабруйскімі майстрамі

Гліна — матэрыял будучыні, упэўнены многія ганчары. Можа знікнуць нафта ды іншая сыравіна, а запасы гліны невычэрпныя. Мы проста ходзім па ёй. Да ўсяго гліна — матэрыял вельмі падатлівы і цёплы. Ужо шэсць тысяч гадоў людзі карыстаюцца керамікай! І яна не згінула, па-ранейшаму запатрабавана.

Вось, напрыклад, для бабруйскага рэгіёна характэрны дымлёныя, тэракотавыя і абварныя вырабы з гліны. Візітоўка — Цэнтр рамёстваў у пасёлку Глуша, дзе створана грунтоўная база для развіцця, папулярызацыі і захавання ганчарнага мастацтва. У верасні 2011 года тэхналогія ганчарных вырабаў майстрамі Бабруйскага раёна ўнесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь.

— А яшчэ бабруйская кераміка вылучаецца своеасаблівымі прапорцыямі, спалучэннем бескаляровай палівы з багатым каларытам чырвонай гліны, сціплымі дэкарыраванымі абводкамі і штампікамі, спецыфічнай канструкцыяй накрывак і ручак, — зазначае кіраўнік народнага аматарскага аб'яднання дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Стары майстар», створанага ў 1987 годзе пры Цэнтры рамёстваў пасёлка Глуша, Валерый Боўда. — Для нашых вырабаў характэрны чысціня форм і колеру, лаканічнасць пластыкі і дэкору, яркая падкрэсленасць прыроднай прыгажосці матэрыялу.

Праз пяць гадоў за высокія дасягненні ў творчасці «Старому майстру» прысвоілі ганаровае званне «Народны калектыў». Два яго ганчары — Юрый Боўда (родны брат Валерыя Боўды) і Аляксандр Арлоў — з'яўляюцца членамі Беларускага саюза майстроў народнай творчасці і маюць званне «Майстар народнай творчасці Беларусі». Дарэчы, пад кіраўніцтвам Аляксандра Арлова ганчарствам і лепкай з гліны ва ўзорным дзіцячым калектыве «Глечыкі», які дзейнічае пры Глушанскім раённым цэнтры рамёстваў, займаюцца і маленькія ганчары.

Бабруйскія ганчары не толькі зберагаюць традыцыйную тэхналогію гліняных вырабаў, але і прыўносяць новае ў тэхналагічны працэс, пры гэтым у кожнага майстра застаецца свой стыль, адчуванне прыгожага. Па ініцыятыве Юрыя Боўды яшчэ 30 гадоў таму распачаўся рух за адраджэнне, захаванне і развіццё ганчарнай справы ў Бабруйскім раёне і ў цэлым на Магілёўшчыне. Юрый Іванавіч валодае старымі тэхналогіямі чорназадымленай і абварной керамікі, вывучае і папулярызуе мясцовыя традыцыі ганчарства, перадае свае веды маладому пакаленню.

Майстру належыць арыгінальны спосаб апрацоўкі гліны — абвар. Юрый Іванавіч часты госць міжнародных ганчарных пленэраў у Расіі, Венесуэле, Арменіі, ва Украіне і пастаянны — у «Горадзе майстроў» на «Славянскім базары ў Віцебску». Керамістам стаў выпадкова. Жыў у пасёлку пад Бабруйскам, дзе знаходзіўся цэх керамікі. Неяк прачытаў у газеце аб'яву пра тое, што туды набіраюць вучняў. Вырашыў пайсці — і яму пашанцавала: трапіў да старых майстроў, вельмі паважаных асоб, якія шчыра дзяліліся сакрэтамі ганчарства.

Дарэчы, майстар па крупіцах узнаўляў тэхналогію абварной керамікі. Штосьці чэрпаў з кніг, а чагосьці дасягаў сам шляхам спроб і памылак. У выніку выпрацаваў уласную тэхналогію.

Абварная кераміка — рабенькая. Пры гэтай адмысловай тэхналогіі расол, у які дабаўляецца мука і іншыя кампаненты, награваецца і ў яго апускаецца гатовы гаршчок. Калі выраб цалкам апусціць у вадкасць, ён можа стаць аднатонны. Дасведчаны ганчар чыста інтуітыўна адчувае, колькі часу неабходна на тое, каб атрымаўся прыгожы і адмысловы малюнак, — лік ідзе на імгненні. Як мароз малюе на шкле ўзоры, так і расол размалёўвае гаршчок.

— Мы не выкарыстоўваем ніякай хіміі, таму наш посуд экалагічна чысты, — зазначае Валерый Боўда. — Напрыклад, абмазваем міску малаком і ставім у печ, дзе тэмпература дасягае 300 градусаў, — атрымліваецца светлая кераміка. Калі 400 градусаў — будзе цёмная, дымлёная. Вырабы па некалькі разоў абпальваем у печы, якая топіцца дровамі. Спачатку топім яе гадзін 12 — 14, каб яна паступова набірала тэмпературу. Потым печ шчыльна закрываем, перакрываем доступ кіслароду. У топку дабаўляем траву, апілкі. Печ паступова астывае, дым цалкам прабівае гліняны чарапок. Такі посуд ужо не прапускае вільгаць. Такі ж вынік і пасля апрацоўкі малаком: вільгаць не праходзіць.

У гліняным посудзе ўсё вельмі добра захоўвалася і не псавалася. Адным словам, увесь посуд быў для здароўя чалавека. Асабіста мяне ўразіў гліняны рукамыйнік. Калі яго крыху зварушыць, ён нахіляецца, і вады выцякае столькі, колькі трэба. Прадумана да дробязей. Дарэчы, посуд, зроблены на ганчарным крузе, звініць пры пастукванні, як званочак.

На базе Цэнтра рамёстваў п. Глуша ўжо дзесяць гадоў запар праводзіўся дзіцячы пленэр керамікі. І кіраўнікам юных ганчароў тут было чаму павучыцца. Сёлета восенню пленэр таксама будзе ладзіцца.

Раіса МАРЧУК

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Ларыса Іванаўна ЦІМОШЫК

Рэдакцыйная калегія:
Таццяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 292-20-51
намеснік галоўнага рэдактара — 292-43-03
адказны сакратар — 292-20-51
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 292-56-53
аддзел прозы і паэзіі — 292-56-53
аддзел мастацтва — 292-20-51
бухгалтэрыя — 287-18-14

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ

Нумар падпісаны ў друк
23.05.2019 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 1129

Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Індэкс 220013

Заказ — 1668

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе, не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.